МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

# Катаванні і жорсткае абыходжанне ў гомельскай жаночай калоніі № 4

Грамадскае расследаванне

**“Мы вельмі любілі там стаяць глядзець на волю”**



© Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі, 2024

# Содержание


**Рэзюмэ** ... 3

**Паказальная калонія № 4: прорва паміж карцінкай і рэальнасцю** ... 6

- **Афіцыйная версія ПК-4** ... 6
- **Калонія вачыма асуджаных жанчын** ... 8
  - Каранцін. Атрад № 8: «Нешта табе мала далі, я б такіх, як ты, расстрэльвала...» ... 8
  - Актыў атрада ... 10
  - Абавязкі, размеркавальная камісія ... 12
  - Распарадак дня: «...адзін тыдзень ты жывеш па першай змене, другі тыдзень ты жывеш па другой...» ... 14
  - Што сабой уяўляюць праверкі? ... 16
  - Бытавыя ўмовы ў атрадах: вошы, пякельны холад і бідэ ... 17
  - Харчаванне ... 20
  - Адзенне ... 22
  - Карэспандэнцыя, пасылкі, спатканні, званкі: «Было вельмі цяжка ў чаканні лістоў...» ... 23
  - Званкі ... 25
  - Спатканні з роднымі (кароткатэрміновыя і доўгатэрміновыя) ... 26

**Рабская праца ў жаночай калоніі** ... 28

- **Фабрыка** ... 28
- **Прыборка тэрыторыі, плуг, дзяжурствы** ... 33
- **Медыцынскае абслугоўванне** ... 38

**Палітычныя зняволеныя** ... 41

**Парушэнні і пакаранні** ... 45

- **Камісія** ... 46
- **Парушэнні** ... 47
- **ШІЗА** ... 49
- **Спецыфічныя незаконныя пакаранні — ноў-хаў ПК-4** ... 51
- **Правакацыі** ... 53
- **Псіхалагічны ціск** ... 56

**Пазаштатныя сітуацыі ў калоніі** ... 59

- **Марыя Калеснікава** ... 60

**Супрацоўнікі калоніі** ... 62

- **Начальнік калоніі і яго намеснікі** ... 63
- **Аператыўныя супрацоўнікі** ... 69
- **Начальнікі атрадаў** ... 77
- **Іншыя супрацоўнікі** ... 80

**Высновы** ... 85



*Фота: Жаночая папраўчая калонія ў Гомелі. Крыніца: Праваабарончы цэнтр «Вясна»*

# РЭЗЮМЭ

***«... калонія на мяне зрабіла вялікае ўражанне. Напэўна, сваёй канцэнтрацыяй нянавісці. І калі ты бачыш тых людзей і разумееш, што ўсё, што ты рабіў, ты ж рабіў і для іх у тым ліку. Разумееш, што ім не тое што гэта не трэба, ты яшчэ... ты не вораг, уласна кажучы, ты так, дурань, юродзівы. Яны не разумеюць, навошта ты гэта рабіў. Яны проста не разумеюць. Напэўна, вось гэта для мяне было адкрыццём, што рэальнасць увогуле — вось гэта. Тое, што табе пашчасціла 40 гадоў пражыць у цудоўным свеце побач з цудоўнымі людзьмі, не значыць, што ўвесь свет такі. Свет іншы, розны...»***

Асноўнай мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца агляд сітуацыі з жанчынамі, якія ўтрымліваюцца ў зняволенні ў Папраўчай установе «Папраўчая калонія № 4» управы Дэпартамента выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных справаў па Гомельскай вобласці.

Паводле афіцыйнай інфармацыі, ПК-4 (размешчаная на вуліцы Антошкіна ў Гомелі) з'яўляецца сучаснай папраўчай установай з інфраструктурай, якая забяспечвае ўсе патрэбы асуджаных жанчын: сталовая, клуб, спартзала, лазня, цырульня, медыцынскі корпус з апаратамі УГД, кваліфікаваным персаналам, зручныя інтэрнаты для «спецкантынгенту». У калоніі пабудаваны асобны корпус Дома малюткі, дзе ўтрымліваюцца дзеці асуджаных жанчын.

Праўладныя журналісты-прапагандысты не раз прысвячалі гэтай калоніі свае рэпартажы. На іх думку, у ПК-4 створаная ідэальная атмасфера і ўмовы

адбыцця пакарання для жанчын, якія нібыта спатыкнуліся. Калонію часта наведваюць розныя дзяржаўныя чыноўнікі, дэпутаты, прадстаўнікі Генеральнай пракуратуры, Дэпартамента выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных справаў і грамадскія наглядальныя камісіі пры Міністэрстве юстыцыі.

Для мэтаў дадзенага даследавання аўтарамі дакумента былі вывучаны 20 інтэрв'ю* (1 818 старонак тэксту) з былымі жанчынамі-асуджанымі, якія адбывалі пакаранне ў ПК-4 у перыяд з траўня 2021 па люты 2024 года. Сярэдні тэрмін адбыцця пакарання ў гэтых жанчын — 15,7 месяцаў. Сумарная працягласць тэрміну знаходжання гэтых жанчын на Антошкіна склала 314 месяцаў. Усе яны былі незаконна асуджаныя пасля прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі ў 2020 годзе і прызнаныя палітычнымі зняволенымі.

Былыя асуджаныя расказваюць пра бытавыя ўмовы ў атрадах, атмасферу ў калоніі, якая створаная яе кіраўніцтвам і падтрымліваецца супрацоўнікамі, «правілы і паняцці». Асобны раздзел прысвечаны таму, як і дзе працуюць жанчыны-асуджаныя, а таксама аплаце іх працы.

Пасля 2020 года кантынгент папраўчай калоніі № 4 заўважна змяніўся са з'яўленнем там палітычных зняволеных. Да асуджаных за звычайныя крымінальныя злачынствы жанчынаў дадаліся жанчыны, якія фактычна пацярпелі за сваю грамадскую пазіцыю, што прымусіла адміністрацыю калоніі змяняць складзеную гадамі сістэму «выпраўлення».

Не сакрэт, што яшчэ з часоў СССР стаўленне зняволеных-«крымінальнікаў» да палітзняволеных было паважлівым, за выключэннем выпадкаў, калі турэмнае кіраўніцтва вымушала іх «прэсаваць» палітычных, збіваць ці рабіць іх існаванне ў лагеры невыносным. Узялі на ўзбраенне такую тактыку і супрацоўнікі ПК-4. Гэта адлюстроўваецца ў размяшчэнні жанчын, асуджаных па палітычных матывах, у атрады з жанчынамі, асуджанымі за забойствы і іншыя сур'ёзныя злачынствы; арганізацыі правакацыяў; натраўліванні асуджаных адно на аднога; заахвочванні даносаў.

Эксперты падрабязна апісваюць розныя этапы знаходжання ў калоніі — ад каранціну і раскладу дня да магчымых парушэнняў і пакаранняў за іх.

Аўтары дакумента разглядаюць беспрэцэдэнтныя выпадкі катаванняў і жорсткага абыходжання з асуджанымі на прыкладзе палітычнай зняволенай **Марыі Калеснікавай**, якая атрымала ў калоніі праваднуню язву страўніка і знаходзіцца ў сітуацыі інкамунікада больш за паўтара гады. Чаму пра яе нічога не вядома нават родным на працягу доўгага часу? Чаму яе хаваюць ад грамадскасці? Пытанні гэтыя далёка не рытарычныя.

* Інтэрв'ю для дадзенага дасследавання былі дадзеныя Праваабарончым цэнтрам «Вясна» і Міжнародным камітэтам па расследаванні катаванняў у Беларусі.

Палітзняволеная **Наталля Хершэ** змагла вырвацца з гэтага пекла толькі дзякуючы ўмяшанню швейцарскага ўрада. Яна, так ж, як і палітзняволеная журналістка **Вольга Класкоўская**, з мноствам хранічных захворванняў неаднаразова змяшчалася ў ШІЗА на месяцы. Пра тое, якую ролю ў захаванні здароўя жанчын граюць медыкі калоніі, тыя, хто вызваліўся, распавядаюць у сваіх гісторыях.

Хто стварыў такія ўмовы для асуджаных жанчын і чаму палітычныя зняволеныя трапляюць пад здзекі, жудасныя катаванні цалкам мэтанакіравана і свядома? Супрацоўнікам калоніі прысвечаны вялікі раздзел расследавання, у якім былыя зняволеныя ўспамінаюць пра свае ўзаемаадносіны з прадстаўнікамі адміністрацыі калоніі, іх прафесійныя і чалавечыя якасці, а таксама метады працы.

Наступствы знаходжання ў калоніі для фізічнага і псіхічнага здароўя ў дадзенай публікацыі не разглядаюцца, бо ацаніць іх ступень цяжкасці можна толькі з прыцягненнем спецыялізаваных экспертаў. Натуральна, вопыт зняволення адбіваецца на далейшым жыцці жанчыны, у тым ліку ў выглядзе складанасцяў сацыяльна-псіхалагічнай адаптацыі, адсутнасці разумення ў адносінах са сваякамі і навакольнымі, разладу ў сям'і і г.д.

Высновы ў расследаванні сфармуляваны коратка: многія міжнародныя стандарты, якія тычацца знаходжання жанчын у месцах пазбаўлення волі, Рэспублікай Беларусь парушаныя. Эксперты ўпэўненыя, што пасля кардынальнай рэарганізацыі пенітэнцыярнай сістэмы Беларусі ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі яе асноўнымі мэтамі стануць рэсацыялізацыя асуджаных, зніжэнне рэцыдыўнай злачыннасці і павышэнне ўзроўню бяспекі ў грамадстве, а не барацьба з іншадумствам.

Аўтары даследавання ўсведамляюць сваю адказнасць за інфармацыю, якую адкрываюць грамадскасці ў дадзенай публікацыі. У няволі ўсё яшчэ застаюцца сотні незаконна асуджаных жанчын, і нават не важна — палітзняволеныя яны ці не. Лішняя адкрытая згадка іх імёнаў можа стварыць для іх новыя складанасці і праблемы (у тым ліку такі ўпадабаны метад пакарання як артыкул 411 КК*). Таму ўсе персанальныя дадзеныя з інтэрв'ю прыбраныя, а факты пра іншых асуджаных прыводзяцца ананімна.

* Крымінальны Кодэкс Рэспублікі Беларусь, Артыкул 411: «Злоснае непадпарадкаванне патрабаванням адміністрацыі папраўчай установы, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года». https://spring96.org/ru/news/112446



*Фота: ПК-4 у Гомелі. Крыніца: sputnik.by*

# ПАКАЗАЛЬНАЯ КАЛОНІЯ № 4: ПРОРВА ПАМІЖ КАРЦІНКАЙ І РЭАЛЬНАСЦЮ

## Афіцыйная версія ПК-4

Папраўчая ўстанова «Папраўчая калонія № 4» управы Дэпартамента выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных справаў па Гомельскай вобласці размешчаная па адрасе: Гомель, вул. Антошкіна, 3. У ёй адбываюць пакаранне ўпершыню асуджаныя жанчыны, якім было прысуджана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі ва ўмовах агульнага рэжыму.

Калонія разлічаная на больш чым 1 700 чалавек.* У ёй ёсць свая цырульня, сталовая, клуб, спартзалы для супрацоўнікаў калоніі і тых, хто адбывае пакаранне. Паводле словаў кіраўніцтва, ёсць ва ўстанове і гасцінічны дом для сваякоў знаволеных, якія прыязджаюць да іх на спатканні. Усяго на тэрыторыі калоніі шэсць інтэрнатаў, дзе пражывае «спецкантынгент». Тут і новая лазня, і новы медыцынскі корпус з апаратамі УГД, і кваліфікаваным персаналам, асобны корпус Дома малюткі, дзе ўтрымліваюцца дзеці асуджаных жанчын. Усё гэта, паводле словаў супрацоўнікаў, прадугледжана правіламі ўнутранага распарадку.

Калонію часта наведваюць розныя дзяржаўныя чыноўнікі, дэпутаты, прадстаўнікі Генеральнай пракуратуры, Дэпартамента выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных справаў, грамадскія назіральныя камісіі

* Паводле непацверджаных дадзеных, з 2020 – 2021 гадоў у калоніі адбываюць пакаранне каля трох тысяч чалавек. https://www.currenttime.tv/a/koloniya-kuda-otpravili-kolesnikovu/31662163.html

пры Міністэрстве юстыцыі* і, вядома ж, журналісты-прапагандысты для стварэння ідэальнай карцінкі гуманнага стаўлення да зняволеных жанчын і выдатных умоваў іх утрымання. Некалькі гадоў таму для гэтых мэтаў быў праведзены маштабны капітальны рамонт некалькіх карпусоў, куды і водзяць высокіх візіцёраў.**



*Фота: Прадстаўнікі Грамадскіх назіральных камісіяў падчас наведвання ПК-4 29 сакавіка 2024 года. Крыніца: minjust.gov.by*

Афіцыйным асобам расказваюць пра тое, што швейную прадукцыю, якую вырабляюць зняволеныя жанчыны, не толькі добра прадаюць унутры краіны, але нават экспартуюць.




*Фота: Інфармацыйны стэнд на тэрыторыі ПК-4 з фотаздымкамі ўзораў швейнай прадукцыі калоніі. Крыніца: sputnik.by*

* Прадстаўнікоў НДА ў грамадскія назіральныя камісіі не ўключаюць.

** https://minjust.gov.by/press/news/politicheskie_partii_obshchestvennye_obedineniya_i_drugie_nekommercheskie_organizatsii/ispravitelnuyu_koloniyu_4_v_gomele_posetili_predstaviteli_obshchestvennykh_nablyudatelnykh_komissiy/

# Калонія вачыма асуджаных жанчын

> ***«Там усё няправільна. Няма ніякага папраўчага працэсу, там проста калечаць людзей…»***
>
> ***«Ты ўвесь час знаходзішся ў калектыве. Там усё зроблена на тое, каб цябе прыгнятаць, каб ты адчуваў сябе адстойным чалавекам і ўвогуле можа нават не чалавекам».***

## Каранцін. Атрад № 8: «Нешта табе мала далі, я б такіх, як ты, расстрэльвала…»

> *«Гэта быў вечар, і ты супер стомлены, галодны, ніякі. У мяне ўжо галава не цяміла. І я ўспрымаю гэты рэжым, у якім адбываецца гэтая перавозка зняволеных, з сабакамі, з крыкамі, з пераноскай гэтых рэчаў без дапамогі, з хуткасцю… Тое, што адбываецца, гэта таксама катаванне. …Вытрымаць гэта нават здароваму чалавеку, а ёсць людзі розных узростаў, якія праходзяць праз гэта, і розных фізічных асаблівасцяў… Не робяць ніякія там паблажкі, таму гэта даволі цяжка для нервовай сістэмы і фізічнай таксама».*

Пасля этапу асуджаныя жанчыны ў калоніі трапляюць на каранцін, дзе праводзяць каля двух тыдняў. У гэты перыяд у іх няма ніякай сувязі са сваякамі.

> *«Каранцін — гэта не кавідны каранцін. Гэта каранцін па ўездзе ў калонію. …каб навучыць, як правільна сябе паводзіць у калоніі: як запраўляць ложачак ахайна, правільна; як, устаўшы, ускокваць проста, калі заходзіць хтосьці ў пагонах; як вітацца на 3-4 і гэтак далей, і гэтак далей. Дрэсіроўка, карацей, 14-дзённая».*

Знаходжанне на каранціне адбываецца ў закрытым корпусе з асобным дворыкам. Стандартная працэдура прыёму новых людзей — гэта дагляд рэчаў (для прафуліку — з асаблівай дбайнасцю), душ, атрыманне формы, размеркаванне па секцыях і ложках.*

> *«Табе даюць гэтую целагрэйку страшную, наогул жудасную, гэтую сукенку, гэты строй, гэтыя чаравікі, у якія ногі немагчыма ўсунуць. Мне новыя трапіліся, так атрымалася, але яны такія неразношаныя, увогуле жахлівыя…»*

* Палітычным зняволеным на двухпавярховых ложках месцы даваліся толькі на 2-м паверсе.

*«Дагляд — гэта асобнае ўвогуле мастацтва каланійскае. Усе твае рэчы проста вось так вось разлятаюцца ва ўсе бакі: гэта нельга, гэта нельга, гэта нельга. І ўсё проста ляціць у торбу і адпраўляецца на склад, дзе проста гніе, калі бацькі, сваякі не забіраюць. І вось так гэта там можа прастаяць некалькі гадоў».*

На каранціне ёсць свая маленькая сталовая, дзе жанчыны прымаюць ежу. Нехта з іх працуе на кухні, адкуль яны носяць у свой корпус цяжкія бакі і бідоны з ежай.

У першыя дні асуджаныя праходзяць медагляд у санчастцы: аналіз крыві, флюараграфія, агляд у стаматолага і гінеколага.

Час на каранціне заняты бясконцым прыбіраннем секцый, калідора і тэрыторыі, вывучэннем Правілаў унутранага распарадку калоніі і раскладу дня.

*«І пастаянныя вучэнні ПУРа. Гэта цэлая кніга такая вялікая — збор законаў і правілаў усялякіх розных ідыёцкіх там, пачынаючы ад таго, што нельга трымаць рыбак і расліны, і заканчваючы тым, што нельга бегаць па дахах. … Але сам жах, што гэта ўсё трэба было вывучыць на памяць і па гэтым здаваць іспыт».*

За час знаходжання ў каранціне з асуджанымі бясконца гутараць розныя супрацоўнікі з рэжымнага аддзелу, начальнік псіхалагічнага забеспячэння, начальнік папраўчага працэсу.

*«З намі шмат разоў гутарылі на каранціне за два тыдні. Гэта парадак такі, што як толькі чалавек заязджае, у прыватнасці экстрэміст, яны яго выклікаюць на размовы, пытаюцца, за што сядзіш, як плануеш адбываць пакаранне».*

*«На гутарцы ён пачаў здалёк, але асноўны мэсадж быў такі, што ў іх ёсць характарыстыка на мяне з Валадаркі, яна дрэнная, і калі я буду паводзіць сябе так, як апісана ў характарыстыцы, маё знаходжанне тут стане невыносным. Калі я буду паводзіць сябе адэкватна і слухацца адміністрацыю, то некаторых момантаў можна будзе пазбегнуць. (На размове з намеснікам начальніка калоніі па аператыўнай дзейнасці С.С. Кавалёвым)».*

Пагрозы пакарання пачынаюцца ўжо на каранціне. Практычна адтуль зняволеная можа патрапіць у штрафны ізалятар за вельмі нязначныя парушэнні: падрыхтоўку да сну раней чым за 30 хвілінаў, мыццё не па рас-

кладзе і іншыя. Прычым парушэнні ў каранціне сумуюцца з парушэннямі, атрыманымі ўжо ў атрадзе.

> *«І да такога даходзіць, што тыпу няправільна на сантыметр прышыты, ну ці крыху менш, па міліметрах, знак нагрудны ці нарукаўны… У каранціне, можа, табе не зробяць яшчэ моцнага чагосьці, можа папярэджанне зробяць, калі неахайна ці няправільна прышыта, прама там 10 сантыметраў адсюль адмяраць, адсюль, адсюль, то ўжо ў атрадзе за гэта выпісвалі палітзняволеным парушэнні. Ну і не толькі палітзняволеным, але з большага, вядома, палітзняволеным».*

Правакацыі і «падставы» пачынаюцца таксама тут.

> *«Але мне пералічылі ўжо там, за нейкі час каранціну, колькі разоў я дала камусьці цыгарэты, колькі разоў я чымсьці падзялілася, пракладкамі ўсялякімі, ну, плюс запіска, плюс яшчэ штосьці-небудзь. Сказалі, што ўжо як мінімум на 30 сутак, можа быць нават больш ужо, штрафнога ізалятара, ёсць».*

Перад размеркаваннем з каранціну ў атрад асуджаным прапануюць далучыцца да адной з секцыяў на выбар — у залежнасці ад пераваг, умення спяваць, танчыць, маляваць і іншае. У адпаведнасці з гэтым размеркаваннем, у далейшым адбыванні пакарання асуджаным размяркоўваюць дзяжурствы па калоніі.

## Актыў атрада

> *«І загадчыкі гаспадаркі некаторыя пачынаюць проста жасціць, і актыву атрада свайго казаць нейкія рэчы, якія аператыўнік па сутнасці не казаў… Так будзе ім больш бонусаў, і гэтак далей. Ну і пачынаюць правакаваць, ціснуць, не вырашаць пытанні, зацягваць вырашэнне нейкіх пытанняў…»*

Ціск на палітычных зняволеных ажыццяўляецца не толькі з боку супрацоўнікаў калоніі, але і ад «актыву» ў атрадах. У атрадах існуе пэўная іерархія, якая выбудоўваецца супрацоўнікамі калоніі. У адрозненне ад «каставай» сістэмы, якая характэрная для мужчынскіх папраўчых установаў, у ПК-4 адсутнічае дзяленне асуджаных на якія-небудзь строга вызначаныя групы. У атрадах выдзяляецца толькі група «актыў» — гэта асуджаныя, якія супрацоўнічаюць са службовымі асобамі калоніі.

> *«… у нас не дзяліліся зэкі па кастах…. Былі розныя ўмовы, «плюшкі» ад адміністрацыі, розныя ўмовы адбыцця пакарання, на-*

*ват маглі атрымаць бальнічны ... актыў атрада, пачынаючы ад загадчыка гаспадаркі».*

Асуджаныя з «актыву» атрада выконваюць розныя функцыі (напрыклад, суправаджэнне іншых асуджаных пры перамяшчэнні з жылой зоны ў іншыя), перш за ўсё, яны дакладваюць пра абстаноўку ў атрадзе аператыўным супрацоўнікам і ўздзейнічаюць як на палітычных, так і на іншых зняволеных. Прадстаўніцы «актыву» атрада ўзначальваюць секцыі ўнутры атрада.

У атрадзе прызначаецца «загадчык гаспадаркі» (далей — заггас). Як правіла, заггас атрада — гэта асуджаная, якая па распараджэнні адміністрацыі выконвае арганізацыйныя, распарадчыя, інфармацыйныя і іншыя функцыі. На гэтую ролю выбіраюць зняволеную, якая згодная выконваць усе распараджэнні кіраўніцтва калоніі і аператыўных супрацоўнікаў (як непасрэдна замацаваных за пэўнымі атрадамі, так і больш высокапастаўленых). Акрамя пэўных уладных паўнамоцтваў (прызначэнне асобаў на дзяжурства па ўзгадненні з начальнікам атрада, вызначэнне, дзе будуць захоўвацца рэчы асуджаных), заггас атрада атрымлівае іншыя прывілеі ад адміністрацыі (не працуе на фабрыцы, не выконвае працы па самаабслугоўванні і інш.).

*«...У кожным атрадзе была загадчыца гаспадаркі. Натуральна, яна працавала на адміністрацыю, усё дакладвала, усё, што адбывалася ў атрадзе. Усю аператыўную інфармацыю, усё жыццё атрада, хто што зрабіў. Хто што не зрабіў».*

Як правіла, у атрадзе выдзяляюць тры секцыі:

1. садзейнічанне арганізацыі побыту і адпачынку асуджаных (САПіАА);
2. арганізацыя працы асуджаных (АПА);
3. абарона правоў асуджаных (АПА).

*«Калі ты далучаешся да секцыі па побыце і адпачынку, то твае дзяжурствы абмяжоўваюцца толькі побытам, напрыклад, дзяжурыць па секцыі, і ты ўдзельнічаеш ва ўсялякіх культурніцкіх мерапрыемствах у клубе, ходзіш выступаць, спяваць, танчыць. Калі ты знаходзішся ў секцыі АПА — гэта абарона правоў асуджаных, то ты дзяжурыш толькі па брамцы і па сталe, гэта ніяк не звязана з правамі асуджаных і іх абаронай, проста дзяжурыш па брамцы і сталах. Гэта наогул ні на што не ўплывае, таму што ты дзяжурыш усё роўна паўсюль, толькі ты павінен трохкутнік на рукаў прышыць з назвай сва-*

*ёй секцыі».*

У кожнай секцыі ёсць старшыня, які складае графікі дзяжурстваў па напрамках секцыі, суправаджае іншых асуджаных пры перамяшчэнні, арганізоўвае вольны час асуджаных і гэтак далей.

*«…Яны, кожны займаецца сваім кірункам, але што ў іх агульнае, што вельмі часта, я падкрэсліваю, не заўсёды, але вельмі часта, гэта людзі, якія, напэўна, наўмысна спрабуюць падставіць палітзняволеных, ну і звычайных зняволеных, якія таксама не падабаюцца ім, ці адміністрацыі калоніі…»*

За такую супрацу «актыў» атрада атрымліваў пэўныя прывілеі і паслабленні з боку супрацоўнікаў калоніі.

*«Складаў [графік дзяжурстваў] таксама актыў атрада і, атрымліваецца, зацвярджаў начальнік атрада, ну і, як мной было заўважана, такія набліжаныя, асабліва набліжаныя да адміністрацыі, то яны і не дзяжурылі…»*

*«…актыў атрада — пару чалавек. Яны таксама працавалі з аператыўнай часткай, з адміністрацыяй калоніі … Яны таксама былі прывілеяваныя: маглі атрымаць бальнічны, паляжаць. Таксама не хадзілі на інвентарныя працы…»*

На адзенні кожнай асуджанай ёсць нагрудны і нарукаўны знакі (іх можа быць тры, то бок асуджаная можа быць ва ўсіх трох секцыях). Нарукаўныя знакі — гэта абазначэнне секцыі, нагрудны знак — фотаздымак, артыкул і дата нараджэння. Калі асуджаная знаходзіцца на прафуліку, нагрудны і нарукаўны знакі ў яе жоўтага колеру. У асуджаных — злосных парушальнікаў (два парушэнні, у ліку якіх ШІЗА) адсутнічае нарукаўны знак.

## Абавязкі, размеркавальная камісія

Навучанню Правілам унутранага распарадку на каранціне надаецца асноўная ўвага — не здаўшы экзамен на іх веданне, асуджаная рызыкуе трапіць у штрафны ізалятар, а не ў атрад.

*«Тады я яшчэ не разумела, да чаго ўсё ідзе, а потым пачалося. Я сказала, што адмаўляцца ад працы не буду, па-другое, я сказала, што падпішу абавязкі. Проста каб выйсці з каранціну. Тыя, хто не падпісваюць, звычайна ідуць адразу ў штрафны ізалятар з каранціну».*

*«Экстрэмісты» здаюць абавязкі асобна і вучаць усе 8 пун-*

*ктаў на памяць. Пытаюцца іх у асобным кабінеце, пры гэтым сам працэс здымаюць на камеру.*

*«...гэта добрасумленна ставіцца да працы, з павагай ставіцца да маёмасці папраўчай установы нумар 4, прымаць удзел у прыбіранні тэрыторыі і самаабслугоўванні. Ну, нешта там старацца..., праяўляць ініцыятыву па выкараненні шкодных звычак, зрабіць усё магчымае па выплаце шкоды, нанесенай злачынствам. То бок, гэта такія 8 пунктаў, якія проста тыпу ты падпісваеш і тым самым абавязваешся працаваць на фабрыц. Так, вось гэтая прымусовая праца. Удзельнічаць у інвентарных працах, ва ўсіх дзяжурствах і гэтак далей...»*

Цікавую гісторыю расказала адна з асуджаных. Калі ў калонію заехала адразу некалькі дзясяткаў палітзняволеных жанчын, адміністрацыя крыху разгубілася. Да іх у кожным атрадзе было па 1-2 «экстрэмісткі». На ўсялякі выпадак ім забаранілі практычна ўсё, што да гэтага было дазволена на каранціне.

*«То бок, мы максімум, што маглі — гэта прыбіраць секцыю і падлогу ў калідоры. А таксама з намі праводзілі гутаркі абсалютна ўсе прадстаўнікі адміністрацыі калоніі. Часам было па 2-3 сустрэчы на дзень. І гэтыя ўсе сустрэчы былі дастаткова аднастайныя, маніпулятыўныя, у спробах высветліць, чаго ж нам не хапала. Заўсёды адно і тое ж пытанне, а чаго ж нам не хапала, што мы выйшлі на вуліцы, ці раскайваемся мы, ці прызналі мы віну і ці збіраемся мы пісаць на памілаванне прэзідэнту Рэспублікі Беларусь».*

Праз два тыдні каранціну праходзіць размеркавальная камісія на чале з Талсцянковым*, начальнікам калоніі, і ўсімі астатнімі начальнікамі атрадаў. Усё, што адбываецца, таксама здымаюць на камеру.

*«Потым было размеркаванне. Размеркаванне — гэта калі збіраюцца ўсе, уся адміністрацыя калоніі. Сядзяць пульхныя цёткі і дзядзькі з важным выглядам, усміхаюцца, а ты заходзіш да іх, стаіш па струнцы ціхмяна, чытаеш рапарт, называючы сваё прозвішча, імя, імя па бацьку, дату нараджэння, артыкул і гэтак далей, і гэтак далей. Яны глядзяць на цябе, у залежнасці ад артыкула могуць і пасмяяцца, могуць прынізіць. Многіх дзяўчатак прыніжалі. Вось так і праходзіць размеркаванне ў калоніі: ты стаіш гэта ўсё выслухоўваеш, табе называюць атрад і ты сыходзіш».*

* Начальнік калоніі ў 2021 годзе.

## Распарадак дня: «...адзін тыдзень ты жывеш па першай змене, другі тыдзень ты жывеш па другой...»

Як распавялі былыя зняволеныя жанчыны, жыццё ў калоніі праходзіць строга па раскладзе. Дзве працоўныя змены вызначаюць, чым павінны займацца зняволеныя ў той ці іншы прамежак часу. Ніжэй дадзеная табліца, у якой адлюстроўваюцца асноўныя пункты распарадку дня (час можа крыху адрознівацца).

Табл. 1. Распарадак дня ў ПК-4

| 1-я змена | Актыўнасць | 2-я змена | Актыўнасць |
|---|---|---|---|
| 6:00 | Пад'ём, гігіена | 6:35 | Пад'ём, гігіена |
| 6:30 | Сняданак | 7:00 | Праверка |
| 7:00 | Пастраенне на працу і праверка | 8:10 | Сняданак |
| 7:30-12:00 | Праца | Пасля сняданку | Выдача медыцынскіх прэпаратаў |
| 12:00 | Абед | 9:30-10:30 | «Вектар» |
| 12:30-14:30 | Праца | 10:30-11:30 | Вольны час |
| 14:30-15:00 | Заканчэнне працы, вяртанне ў атрад | 11:30-12:20 | «Вектар» |
| 15:00-16:00 | Вольны час (кава-гарбата) | 13:10 | Абед |
| 16:00 | Пастраенне – праверка | 14:00 | Пастраенне на працу |
| 16:30-17:30 | «Вектар»** – прагляд адмысловай праграмы калоніі ў спецыяльным памяшканні выхаваўчай працы. | 15:00-16:30 | Праца |
| 17:30 | Выдача медыцынскіх прэпаратаў (пры неабходнасці) | 16:30 | Перапынак |
| 18:00-18:50 | Вольны час (кава-гарбата)* «Вектар» | Пасля перапынку | Праца |
| 19:10 | Вячэра | 18:00 | Вячэра **** |
| 20:00-20:30 | Вечаровая праверка прафілактычнага ўліку | 21:50 | Заканчэнне працы |
| 20:30-21:30 | Вольны час***, калі ты можаш пераапрануцца ў сваё адзенне. | 21:50-22:20 | Вечаровая праверка прафілактычнага ўліку |
| 21:30 | Падрыхтоўка да адбою | 22:30 | Падрыхтоўка да адбою |
| 22:00 | Адбой | 23:00 | Адбой |

### Заўвагі

*«Вектар» — гэта ўнутранае тэлебачанне калоніі. У асноўным там паказваюць тое, што адбывалася ў клубе, зборы, лекцыі ці конкурсы мастацкай самадзейнасці. Таксама там ідуць лекцыі ананімных алкаголікаў. І па нядзелях трансляваўся фільм.

> *«... часцей за ўсё гэта ці прапагандысцкія нейкія фільмы, як «Клуб рэдактараў», прычым, адны і тыя ж. Гэта ўсё па коле. Пра Tut.by вельмі шмат круцілі нам. Усялякія пакаяльныя відэа вельмі любілі, Азаронка. Або ж пра дасягненні Беларусі: які ў нас цудоўны ваенпрам, як мы там усюды ўсіх перамаглі, як у нас з Расіяй, мы інтэгруемся ўсяляк і ў нас усё цудоўна. Мы павінны былі сядзець, глядзець. Пры гэтым нельга чытаць, нельга пісаць, нельга нават спаць, нельга заплюшчваць вочы. Таму што заграс ходзіць і кантралюе. Калі кагосьці зловіць, то за-*

*пісвае ў свой нататнік, і гэта можа быць як парушэнне — ты павінен сядзець і глядзець».*

*** «Вось гэтыя перапынкі паміж «Вектарам» — гэта адзіны час перакусу ці яшчэ чаго-небудзь, што ў цябе можа быць. У любы з гэтых момантаў можа нехта прыйсці і сказаць, што зараз мы ўсе ідзем са скрынкамі, ці прыдумаць яшчэ нейкую забаўку — пакаранне ў тым, што вы робіце нейкае бессэнсоўнае глупства замест таго, што вы маглі гэтую гадзіну адпачыць і выдаткаваць яе на сябе».*

**** «Калі ты на вячэры не змог паесці, калі нейкая дрэнная ежа ці яшчэ нешта, то ты ўжо не паясі да наступнай раніцы».*

З магчымасцяў адпачынку ў калоніі прадугледжаныя спартзала, бібліятэка, гурток сваімі рукамі, наведванне царквы. На гэта для асуджаных адведзена каля трох гадзінаў у дзень, аднак, на думку адміністрацыі, гэты час можна правесці, прыбіраючы тэрыторыю або выконваючы іншыя загады.

*«Да канца атрымалася так, што палітычным забаранілі наведваць спартзалу, бібліятэкай можна было карыстацца, але не хадзіць у яе, проста прасіць, каб нехта кнігі прынёс, нельга было карыстацца гуртком. Ты мог запісацца ў гуртکі, але цябе адтуль выпісвалі, на табе стаіць забарона, што ты не можаш хадзіць туды. Яшчэ маглі паставіць забарону, напрыклад, на клуб. Гэта ўсё індывідуальна было. Адны аператыўныя супрацоўнікі ў сваіх атрадах усім палітычным забаранялі такія рэчы. Я перайшла ў 19-ты атрад, там мне дазволілі хадзіць у спартзалу. Былі атрады, дзе прынцыпова забаранялася. У адным з атрадаў палітычным забаранялася хадзіць у царкву».*

Вольны час у калоніі ўяўляў з сябе ў асноўным прагляд перадачаў, якія трансляваў «Вектар».

*«Сумарная колькасць «Вектараў» па часе ў нядзелю — каля чатырох гадзінаў. Два раніцай і ўвечары доўгі. То бок, чатыры гадзіны на дзень ты проста павінен сядзець, тэлевізар глядзець, пры гэтым не можаш там ні чытаць, ні пісаць, нічога няма, бо пад камерай сядзіш».*

*«Я хадзіла ў царкву і мне было дазволена хадзіць у клуб. [імя]... нельга было хадзіць у царкву і яна вельмі доўга ўпрошвала аператыўнага работніка, каб ёй дазволілі зайсці ў царкву свечку паставіць за спачын свайго сваяка. Два тыдні ўпрошвала. Але ёй можна было ў спартзалу. Ёй перыядычна то дазвалялі,*

*то адмянялі. Як яны выбіралі, каму можна, а каму не, па якой прычыне — таксама невядома».*

Як распавядаюць жанчыны, яшчэ тры гады таму былі дазволеныя па 5 кніг на кожную асуджаную. Іх можна было перадаць з дому. Былі дазволеныя раздрукоўкі кніг. Аднак, з паступлennем у калонію палітычных зняволеных, гэта было забаронена. Зараз у калоніі забаранілі любую навучальную літаратуру і літаратуру на замежнай мове.

*«Ты не можаш, нават калі ты сядзіш ужо 7 гадоў, паганяць нейкія словы па-ангельску, ты не можаш вывучыць польскую. Мне, напрыклад, забаранілі навучанне на Ешка».*

## Што сабой уяўляюць праверкі?

*«… калі ты не на фабрыцы, яны адбываюцца аднолькава: вы проста ўсе становіцеся, прафулік заўсёды становіцца ў самай першай лініі, любы прафулік, незалежна ад таго, палітычны ці нейкі іншы. Вы становіцеся ў шэраг 5 чалавек, і так за вамі 5 чалавек, і тыпу, атрымліваюцца такія вось калоны. Потым… вы стаіце і чакаеце, пакуль вас прыйдуць праверыць. Праверка складаецца з 2 частак: гэта калі вас чытаюць і калі вас лічаць. То бок, чытаюць вас па картках, і гэтым займаюцца афіцэры. У іх ёсць стосік картак, і на іх, я так разумею, ёсць фотаздымак, ёсць агульная інфармацыя пра цябе: артыкул, тэрмін, і калі гэта прафулік, то картка жоўтая…»*

Афіцэры называюць прозвішча зняволенай, яна робіць крок наперад і адначасова гаворыць сваё імя і імя па бацьку. Апроч зверкі дадзеных зняволеных, адбываецца колькасная праверка. Гэтым займаюцца кантралёры, якія ходзяць па ўсёй калоніі і лічаць, колькі чалавек у кожным атрадзе. Лічбы картак павінны сысціся з дадзенымі кантралёраў. Гэты працэс займае ў сярэднім 20-30 хвілінаў.

Для палітычных зняволеных прадугледжаная дадатковая прафілактычная праверка паміж праглядам «Вектара», на якую выходзіць не ўвесь атрад. Асуджаныя, якія знаходзяцца на прафуліку, прыходзяць правярацца на свае ўчасткі.

*«Гэта трэба выйсці на вуліцу і дачакацца, пакуль прыйдуць кантралёры, ваенныя. Праверка пачынаецца а 8 гадзіне. Калі гэта была зіма, яны заўжды прыходзілі а 8:25 — 8:30. То бок, трэба было проста паўгадзіны стаяць на марозе і іх чакаць».*

## Бытавыя ўмовы ў атрадах: вошы, пякельны холад і бідэ

*«Першы аспект, гэта пра тое, што могуць адрозніваца ўмовы ўтрымання. ...можа быць дзірка ў падлозе, прыбіральня старая, смярдзючая, з засохлым лайном, а можа быць звычайная прыбіральня белая, на якую можна пасадзіць попу. Што таксама здаецца дзіўна, напэўна, падкрэсліваць гэта, але для псіхалагічнага камфорту, калі ты заматаны бегаеш і не спыняешся ні на секунду, важныя такія дробязі, каб ты адчуваў хаця б у нейкіх элементарных патрэбах сябе не прыніжаным, брудным...»*

Бытавыя ўмовы зняволеных калоніі залежаць ад корпуса, у якім размяшчаецца атрад. Правіламі ўнутранага распарадку афіцыйна мыцца дазволена ў так званы лазневы дзень. І таксама ёсць дадатковы дзень, ён так і называецца — дзень мыцця галавы, калі можна памыць валасы. Ёсць, напрыклад, памяшканні атрада, у якіх ёсць адно бідэ на 80 чалавек, але можа не быць душа, дзе можна было б памыцца цалкам. У нейкіх атрадах душ ёсць, але ім нельга карыстацца, бо мыцца можна толькі адзін раз на тыдзень.

У старым трухлявым будынку 15-га атраду, паводле словаў былых зняволеных, напрыклад, няма душа. На ўвесь атрад 4 ракавіны, адзін нагамыйнік. На першым паверсе 5 унітазаў, але адзін адведзены пад начальніцу атрада. То бок 4 унітазы на ўвесь атрад і адно бідэ. Такім наборам зручнасцяў павінны абыходзіцца 80 жанчынаў. Пакой прыёму ежы таксама вельмі маленькі, і падчас прыёму ежы жанчыны туды не змяшчаюцца, ім даводзіцца прымаць ежу ў іншых дапаможных памяшканнях, уключаючы памывачную. У памывачнай ёсць дзве пральныя машыны і тумбачка для гаспадарчых рэчаў.

*«І дзяжурная ляціць у прыбіральню, прыбірае там усё літаральна за хвіліну, каб было больш-менш, і толькі потым начальніца ідзе. Але часцей за ўсё гэта было так: нехта крычыць «прыбіральня начальніцы», і дзяжурная ідзе выганяць усіх з прыбіральні. Пляваць, што ты там рабіла, ты выходзіш адтуль, дзяжурная ўсё прыбірае, а потым ад хвіліны да паўгадзіны дзяжурны стаіць і дбае, каб ніхто ў прыбіральню не заходзіў. Таму што начальніца можа сказаць, што ёй патрэбная прыбіральня, а потым запрацавацца ці нешта яшчэ, забіць і забыцца пра тое, што ў гэты час 90 ці 100 чалавек не ходзяць у прыбіральню і чакаюць».*

У 16-м атрадзе — вільгаць і цвіль, вельмі халодна; у 14-м атрадзе падобна, што рамонту не было вельмі даўно — сцены і падлога абадраныя, сантэхніка старая і ўбогая.

> *«І там у прыбіральнях знаходзіліся ўнітазы і бідэ адно на 80 чалавек. Стаялі рукамыйнікі і нагамыйнікі, то бок цалкам памыцца не было магчымасці».*

> *«Праз паўтара месяцы…мяне перавялі ў 14-ты атрад. Я была ў шоку, калі я прыйшла ў гэты атрад. Гэта быў нейкі бамжатнік проста. Мне падалося што 15-ты атрад не вельмі, але калі я ўбачыла 14-ты — гэта быў нейкі жах. Ты заходзіш, там абадраныя сцены і падлога. Заходзіш у ракавіну — там адлегласць паміж кранам і ракавінай … То бок галаву там памыць нерэальна. Там вельмі старыя ракавіны, якія ты не адмыеш. Там такі слой іржы і ўсялякай жэсці, што можна было звар'яцець».*

> *«Думала, як мне памыцца, як схадзіць у прыбіральню, таму што гэта 5 унітазаў, якія стаяць адзін насупраць аднаго і падзеленыя звычайнай фіранкай. І проста каб зайсці ў прыбіральню, а там ёсць людзі, трэба пастарацца не спатыкнуцца аб каленкі іншых людзей. Там падзельнікі паміж унітазамі не такія шырокія, каб ты не бачыў што там і каго. І ў прынцыпе ўсё, ты не хочаш гэтага бачыць, але твой бакавы зрок захоплівае ўсё, што адбываецца. У прыбіральню проста нерэальна схадзіць было, гэта было вечнае «пацярпець».*

Нягледзячы на тое, што 16-ты атрад лічыцца паказальным і туды вельмі часта заходзіць адміністрацыя, бытавыя ўмовы там, паводле словаў жанчынаў, былі вельмі дрэнныя. Першае — вельмі халодна. Старыя драўляныя вокны зусім не трымаюць цеплыню. Няма сушкі, дзе можна сушыць рэчы. Непасрэдна ў секцыі захоўваюцца курткі, абутак, стаіць халадзільнік і вельмі маленькая шафка з локерамі* (1 на 4 чалавекі). У прыбіральні 4 кабінкі з унітазамі. Душам карыстацца дазваляюць. Агулам 16-ты атрад лічыцца «наркаманскім» атрадам, таму што там знаходзіцца шмат людзей, якія сядзяць па 328-м крымінальным артыкуле.

Ёсць атрады з вялікімі капцёркамі з вялікімі ячэйкамі для скрынак з рэчамі, якія размяшчаюцца ў 3-4 ярусы. У некаторых атрадах капцёркі 2 на 2 метры з маленькімі ячэйкамі для рэчаў, у якія складана змясціць усе рэчы. Нядрэнныя водгукі былых асуджаных пра **7-мы, 9-ты і 17-ты** атрады: у іх дастаткова цёпла і нядрэнныя бытавыя ўмовы. Ёсць душы з фіранкамі, нагамыйнікі.

---

* Закрытая ячэйка для прадуктаў.

У 9-м атрадзе 2 асобныя пакоі з бідэ, ёсць кухня. У кухні 2 сталы для абедаў, крэслы. Па перыметры кухні стаяць шафы з ячэйкамі, якія называюцца локеры. Яны зробленыя з металу і прадугледжаныя для таго, каб у іх можна было захоўваць прадукты, зачыняючы на ключ. Але ў адміністрацыі павінен быць доступ да іх змесціва, і таму забараняюць іх замыкаць. У кухні 2 халадзільнікі. Але ў кожным атрадзе па-рознаму, недзе можа быць і 3 халадзільнікі. Тумбачка ля разеткі, каб на ёй кіпяціць ваду. У некаторых атрадах ёсць чайнікі, недзе іх няма і трэба карыстацца кіпяцільнікамі.

**19-ты атрад** размешчаны ў тым жа будынку, у якім знаходзіцца і 9-ты атрад. То бок па ўмовах там усё ідэнтычна.

У **13-м атрадзе** (размешчаны ў корпусе з назвай «Бамбей») адзін істотны недахоп: там вельмі халодна. Нягледзячы на тое, што корпус дастаткова новы і адрамантаваны, вокны там устаўленыя няправільна, таму ў памяшканні пастаянны скразняк. Паводле словаў жанчынаў, у гэты атрад адпраўляюць людзей у пакаранне.

> *«1-га кастрычніка зэчкі, жанчыны мне казалі, што «ну вось, [імя]..., ты яшчэ не бачыла зімы, зімой будзем накрывацца целагрэйкамі».*

Я, кладучыся спаць, у прынцыпе, як і ўсе іншыя жанчыны, спала не толькі пад целагрэйкай. Я надзявала ўсе рэчы, што ёсць у мяне, таму што памяшканне астывала так, што гэта было нерэальна».

У атрадзе ёсць 2 душы. Але карыстацца імі забараняюць. Мыцца трэба хадзіць абавязкова ў лазню, дзе няма нармальных умоваў.

> *«Там ёсць душ, які наведваецца адзін раз на тыдзень, і прымаць яго можна толькі 15 хвілінаў, але гэта ад моманту ўваходу ў душ. Заходзіў увесь атрад, то бок шмат чалавек. Адпраўляюць у душ. Там некалькі душавых кабінак. І давалася 15 хвілінаў з моманту, як мы ўвайшлі, то бок гэта распрануцца, вельмі хутка прыняць душ, выцерціся і апрануцца. Адзін раз на тыдзень. Увесь астатні час мы, скажам так, мыліся з бутэлечкі над унітазам, неяк імкнуліся прыстасавацца, але гэта было немагчыма...гэта не прамыць галаву ў такім душы, нічога. Прычым, пасля душа, калі ты выходзіш ужо такі распараны, разагрэты, увесь мокры, нягледзячы на тое, што на вуліцы вельмі халодна, ты ўсё адно ідзеш па вуліцы, калі гэта душ быў перад сном».*

> *«Я была ў розных атрадах кожны месяц, то бок я памяняла 10 атрадаў, і розныя атрады выглядаюць па-рознаму. У большас-*

*ці сваёй ва ўсіх атрадах дрэнна ідуць справы з санітарна-бытавымі ўмовамі, то бок гэта і дрэнная сантэхніка, і смурод, гэта і розныя жыўнасці, ну то бок там жукі, павукі, таракашкі, у большасці атрадаў былі паўсюль бялізнавыя вошы. Увечары, калі я сядала чытаць, я надзявала акуляры, а акуляры ў мяне на вельмі вялікі плюс, я спецыяльна папрасіла ў бацькоў набыць, таму што там дрэннае асвятленне. У гэтых акулярах я разгледзела бялізнавых вошай на падушцы».*

Датычна сродкаў гігіены жанчыны ў асноўным павінны былі клапаціцца самі. Адзін раз на месяц ім выдавалі гаспадарчае мыла, адну ўпакоўку пракладак і туалетную паперу.

*«Часам пракладак няма, часам няма туалетнай паперы. А часам пракладак і туалетнай паперы няма ў краме. Ну, ток бок, гэта дадатковы раз цябе пысай у лайно проста акунаюць і паказваюць лішні раз тваё месца. Не пра тое, што нават памыцца, з гэтым ты ўжо неяк змірылася. З тым, што ты проста два гады ходзіш брудны. І размазваеш гэты бруд з адной часткі цела на іншую частку цела. І яшчэ ты там нармальна не можаш паклапаціцца пра сваю менструацыю. І гэта, як па мне, настолькі дзіка...»*

## Харчаванне

У калоніі трохразовае харчаванне па раскладзе. Паводле аповедаў асуджаных, якія там сядзяць з 2019 года, раней харчаванне было жудаснае, і ў краме прадуктаў было мала.

*«Зараз, асабліва калі ўсялякія праверкі прыязджалі, там мяса досыць шмат, рыба нейкая, якая-ніякая, смажаныя рыбныя катлеты, кашы ранішнія цалкам нядрэнныя, масла 2-3 разы на тыдзень, яйкі. Ну, у прынцыпе, харчаванне, ад голаду не памрэш, то бок калі там без дапамогі асабліва. Супы такія больш-менш. Рацыён такі: зранку каша, звычайна на малацэ, кавалак хлеба белага, гарбата. У абед першая страва — суп, другое, кампот-кісель, паў кавалка белага хлеба, кавалак чорнага хлеба. Увечары таксама нейкая страва, кавалак белага хлеба, гарбата.*

У прынцыпе, каб жыць, гэтага хапае. Але, натуральна, гэта ежа такая сталоўская, то бок там нейкіх смакавых якасцяў, вядома, няма, звычайная такая ежа, якая досыць хутка прыядаецца».

Некаторыя жанчыны не харчуюцца ў сталовай, а набываюць ежу ў краме, а таксама харчуюцца тымі прадуктамі, якія перадаюць сваякі. Аднак такая сітуацыя з харчаваннем далёка не ва ўсіх.

> *«Калі ёсць пазовы, ці ты злосны парушальнік (маеш некалькі непагашаных парушэнняў), то ў цябе абмежаванне 64 рублі* **[прыблізна 19 $]**, *гэта дзве базавыя. Калі няма пазоваў і ты не «злоснік» і не абавязаны, то ліміт 192 рублі* **[прыблізна 58 $]**, *чатыры базавыя. Мне 192-х рублёў на месяц не хапала. 64 рублі — гэта наагул ні пра што, гэта цыгарэтаў не набыць. Умоўна, набыць сабе на месяц толькі цыгарэты і каву. Гэта ні салодкага... Трэба за гэтыя 64 рублі і гігіену сабе набыць, ці касметыку. На 64 рублі цяжка рэальна жыць».*

У краме, акрамя прадуктаў, жанчыны могуць набыць касметыку, у асноўным «Беліта-Вітэкс», вільготныя сурвэткі, туалетную паперу. У месяц прадугледжаныя тры «атаваркі» на кожны атрад. Як правіла, гэта пачатак, сярэдзіна і канец месяца.

> *«Часам няма паперы ў краме, пры тым, што няма нават сурвэтак. Часам скупляюць і вільготныя сурвэткі, усё папяровае, што ёсць у краме, яго можа рэзка не стаць, таму даводзіцца хадзіць, пытацца, хто можа пазычыць туалетную паперу. Я сутыкалася з гэтым двойчы ці тройчы, нават і паперы можа не быць не пару дзён, а тыдзень-два».*

Вельмі часта ў калонію прывозяць прадукты, якім засталося некалькі дзён да канца тэрміна прыдатнасці. Гэта тычыцца малочных прадуктаў — тварагу, ёгуртаў, кефіру, малака. Набытыя прадукты павінны захоўвацца ў халадзільніках, і тэрмін іх прыдатнасці старанна правяраецца. У той жа час многія жанчыны скардзяцца на крадзеж прадуктаў з халадзільніка.

Многім жанчынам такога харчавання не хапала.

> *«І недзе месяц ці тры тыдні ў мяне нічога ўвогуле не было з ежы, акрамя гарбаты. І я прама адчула, што я ўвесь час галодная. Калі ты прыходзіш у сталовую, там вельмі гарачая ежа. Пакуль ты надзьмеш на гэтую ежу, каб яна астыла, ты проста абпальваеш сабе рот і не паспяваеш за гэты час, які даецца на ўсю гэтую ежу. У дзяўчатак нейкі там запечаны рот, што яны могуць гэта з'есці, а я не магла. За першы месяц я на кілаграмаў пяць схуднела».*

> *«Але паколькі вельмі шмат фізічнай працы, ... ты на гэтым якраз-такі не паправішся, хутчэй, схуднееш. З голаду не памрэш, бо ўсё роўна гэта калорыі. Калі ўжо зусім адчуваеш*

*сябе галодным — там заўсёды ўдосталь хлеба, можаш наесціся. То бок яго многія не ядуць, таму што ён нясмачны як бы, ну такі...»*

## Адзенне

Увесь кантынгент абавязаны насіць адзіную форму адзення. Адзенне — гэта летняя форменная сукенка, ружовая ў белую кветачку, і хустка.

> *«Яшчэ выдаюць строй — гэта спадніца, кашуля і пінжак. Гэта целагрэйка сіняга колеру. Калі ў цябе тэрмін большы за 5 гадоў, то табе выдаюць 2 строі і 2 сукенкі, але ў нас, напэўна, толькі тым, у каго быў тэрмін ад 10-ці гадоў, выдалі 2 сукенкі і 2 строі. Мне не выдалі, я потым набывала ў краме асобна адмыслова.*

Плюс табе выдаюць абутак — гэта так званыя чувякі. Гэта тыпу штосьці каля балетак, там плоская падэшва. І тыпу чаравікі такія, ну, грубыя, ну не ведаю, як у працоўных там на заводах усялякіх, такія чаравікі. І даюць сланцы».

Выдаюць таксама некалькі параў шкарпэтак, адзін бюстгальтар, легінсы (цёплыя штаны).

> *«Выдаюць таксама жудасныя калготы, з якіх усе смяяліся, таму што пасля 1-га выкарыстання каленка выцягваецца настолькі, што дастае да шчыкалаткі. І ты кожны раз, калі апранаеш гэтыя калготы, спачатку яны ў цябе на таліі, потым пад грудзямі, потым над грудзямі, а потым ужо можна на галаве завязаць банцік. То бок яны так вельмі добра, вельмі хутка расцягваюцца. Брэсцкі шкарпэткава-панчошны камбінат. І выдаюць форменны абутак. Тое, што я пералічыла, за*



*Фота: Летняя форма адзення зняволеных жанчын у ПК-4. Крыніца: belta.by*



*Фота: Зімовая форма адзення зняволеных жанчын у ПК-4. Крыніца: dson6cgvys1hu.cloudfront.net*

*выключэннем шкарпэтак, станікаў і калготаў, ад гэтага адмовіцца нельга. То бок ты павінна мець на руках шапку, хустку, сукенку, строй, целагу і абутак. Гэта чаравікі і гэта туфлі».*

Паводле былых зняволеных, у пераліку дазволенага ў калоніі адзення — 2 нацельныя майкі, 2 майкі чорныя з кароткім рукавом, 2 майкі чорныя з доўгім рукавом, два чорныя джэмперы, 2 легінсаў, 8 параў шкарпэтак, 8 трусоў, начная сарочка ці піжама летняя, піжама зімовая, пальчаткі, рукавіцы, шалік, шапка. Абутак восеньскі, абутак зімовы, абутак летні, басаножкі. Насоўка, ды 2-3 станіка. Усё лішняе адпраўляецца на цэнтральны склад. У залежнасці ад сезону адзенне і абутак мяняюцца.

## Карэспандэнцыя, пасылкі, спатканні, званкі: «Было вельмі цяжка ў чаканні лістоў...»

***«Ты ў іх пытаешся:***

***«А што з карэспандэнцыяй?»***

***Яны адказваюць:***

***«Вам ніхто не піша.***

***А з чаго вы ўзялі, што ўвогуле пра вас хтосьці памятае?»***

Згодна з Крымінальна-выканаўчым кодэксам Рэспублікі Беларусь, асуджаныя могуць атрымліваць карэспандэнцыю без абмежавання. Уся перапіска падлягае цэнзуры.*

*«І ў калоніі мне сапраўды пачалі прыходзіць лісты ад людзей, якія мне пісалі ў Следчы ізалятар цэлы год, прыходзілі лісты там з двухзначнай нумарацыяй, то бок, ну, чалавек пісаў, нумараваў, а я не атрымлівала нічога да гэтага. Пры гэтым атрымліваецца, што той, хто пісаў... ён, не атрымліваючы адказу, увогуле не разумеў, куды ён піша, у нікуды проста. І працягваў пісаць, прычым не караценькія там нейкія запісачкі, а такія добрыя, вялізныя лісты».*

Як распавядалі былыя зняволеныя, да студзеня 2022 года карэспандэнцыя даходзіла да/ад іх нармальна. Аднак са студзеня сітуацыя рэзка змянілася. Зняволеным пачалі ствараць інфармацыйны вакуум, пакінуўшы ліставанне толькі з блізкімі сваякамі.

* КВК РБ. Арт. 85, часткі 1, 2.

*«Прыкладна са студзеня 22-га года абмежавалі перапіску, і пачалі даходзіць толькі лісты ад блізкіх сваякоў, і на выхад таксама нічога не атрымлівалася. Я спрабавала пісаць сяброўкам рознымі спосабамі, і нічога не даходзіла, аж да таго, што нават калі я там часам пісала як бы бацькам, але там быў ліст сяброўцы, бацькам гэтыя лісты таксама не даходзілі».*

Многія са зняволеных звязваюць абмежаванне карэспандэнцыі з пачаткам вайны ва Украіне.

*«...у лютым яны перасталі прыходзіць. ... усім, з кім я камунікавала [з палітычных], ва ўсіх аднолькавая сітуацыя, што прыходзіць толькі ад самых блізкіх сваякоў, і тое выбарачна. Ад лютага 22-га года яны перасталі ўсім прыходзіць, то бок ад незнаёмых людзей, ад сяброў, ад усіх. Гэта дакладна не рашэнне асобна нашай калоніі. Таму што я размаўляла са сваімі падзельнікамі з мужчынскіх калоніяў, і мы высветлілі, што ў нас у адзін час гэта ўсё здарылася».*

*«Пасля новага года іх стала менш-менш-менш, то бок мы наўпрост заўважылі, што вельмі вялікая розніца. Першымі перасталі прыходзіць заказныя лісты. То бок, калі раней мы ўсе, уся палітыка сустракалася на заказных лістах, бо іх атрымлівалі асобна, то ў нейкі момант мы проста зразумелі, што няма заказных лістоў. Потым пачалі сыходзіць звычайныя. Паціху-паціху, а пасля 24-га наогул нуль, пасля 24 лютага».*

Жанчыны расказваюць, што вельмі часта атрыманне лістоў адміністрацыя выкарыстоўвае як дадатковы шантаж зняволенай. Напрыклад, прымушаюць прызнаць віну.

*«Потым, калі дабіліся прызнання віны, усё, зноў адпусцілі сітуацыю, зноў нармальна, спакойна перапісвалася. То бок, гэта проста любая нагода для таго, каб, калі ім трэба на чалавека націснуць, чалавека зламаць, яны карысталіся любымі нагодамі абсалютна».*

Не выходзіла за сцены калоніі карэспандэнцыя юрыдычнага характару — скаргі на адміністрацыю, напрыклад.

*«... усе скаргі на парушэнне правоў крымінальна-выканаўчага кодэксу ў пракуратуру і не толькі, якія я адпраўляла з калоніі, яны не выходзілі з калоніі. Значыць, адказная службовая асоба, якая гэтым займалася, іх блакавала. За выключэннем скаргаў на абскарджанне прысуду».*

Акрамя цэнзараў, якія абавязаныя сачыць за зместам перапіскі, гэтым займаюцца ўжо па ўласнай ініцыятыве начальнікі атрадаў — для дадатковага прэсінгу на асуджаных. Многія лісты яны знішчаюць пры жанчыне, самавольна трактуючы іх змест, многія лісты знішчаюцца без яе ведама.

*«Даніла Валянцінавіч Баранаў даведаўся маё слабое месца — гэта лісты ад мамы — і пачаў іх сістэматычна знішчаць. Ён прыходзіў у атрад, выклікаў мяне ў адну з секцыяў і казаў: «Так — ліст. Я пачытаў і нешта тут не так». Я: "А што тут не так?» — «Занадта шмат цынізму. Далей была цытата «цынізму». Значыць, трэба пісаць без цынізму. Цынізм не выкарыстоўваем». ... Ці было так: бралася некалькі лістоў, узважвалася, якія цяжэй, з фотаздымкамі, паштоўкамі — на знішчэнне. Было знішчана ў суме больш за 10 лістоў ад маёй мамы запар. То бок я больш за месяц ад яе не атрымлівала лістоў наагул. Гэта былі і фотаздымкі, і нейкія паштоўкі».*

*«Пшанічнікава лісты любіла рваць, прычым нават звычайныя зэчкі скардзіліся на яе. Прынцып быў такі: «Ці ты там робіш тое, што мне трэба, ці я вось зараз ірву ліст».*

*«У маёй прысутнасці ліст ірвуць, складаюць акт, што ён ліквідаваўся, гэты лісток. І потым праз бацькоў я гэта спрабую даведацца: а што ж такое мой сябар напісаў цынічнага? Насамрэч, мой сябар прывітаўся з цэнзарамі. І гэта для іх «цынічны» характар».*

## Званкі

У месяц кожнай асуджанай, згодна з КПК, належыць 4 звычайныя і 2 відэазванкі з блізкімі сваякамі. Як пакаранне для парушальнікаў званкі могуць адмяніць.

*«... тэлефоны прама відавочна шумяць. А ў нейкі момант, калі табе здаецца, што гэта параноя, ты пачынаеш чуць на тым баку слухаўкі не таго чалавека, які з табой размаўляе, а проста голас супрацоўніка адміністрацыі, які, хутчэй за ўсё, сядзіць і кантралюе, каб менавіта запісвалася размова, ці кантралюе, што ты кажаш, таму што ў любы момант, па сутнасці, яны гэта кажуць, яны могуць выключыць запіс і спыніць спатканне з роднымі».*

Зняволеныя адзначаюць, што да снежня 2022 года прыбралі два званкі, і засталіся адзін відэазванок і 3 звычайныя.

## Спатканні з роднымі (кароткатэрміновыя і доўгатэрміновыя)

Згодна з КПК, асуджаным належыць 1 працяглае і 1 кароткае спатканне раз на 4 месяцы. Аднак дабіцца належных спатканняў атрымлівалася далёка не ўсім і не заўсёды. Пазбаўленне спатканняў адбываецца за самыя нязначныя правіны па рашэнні камісіі па пакараннях.

**Кароткатэрміновыя спатканні** з роднымі праходзяць у адмысловым будынку, дзе зняволеныя таксама сустракаюцца з адвакатамі.

> *«Гэта выглядае, як доўгая будка, умоўна, і слухаўкі. Апараты, каля кожнага крэсла. Там шмат апаратаў, я не памятаю, 6 з аднаго боку, і 6 з іншага боку, мабыць. Адзін бок для волі і адзін бок для асуджаных... калі ёсць магчымасць, палітзняволеных спрабуюць ізаляваць».*

Відавочна, што людзей рассаджваюць на пэўныя месцы спецыяльна, каб змест размовы можна было праслухоўваць і гэтаму не перашкаджалі пабочныя гукі ад тых, хто побач сядзіць.

**Доўгае спатканне** адбываецца ў асобным доміку, там ёсць прыбіральня і душавая, нумары. Адзін нумар — два ложкі, тумбачкі, стол і асобная агульная на ўсіх кухня. Працягласць спаткання — ад 1-х да 3-х сутак.

Пра спатканні са сваякамі асуджаныя павінны паведаміць ім самастойна. Аднак часта здаралася, што яны не паспявалі гэта зрабіць, бо ліст можа выходзіць з калоніі і тры дні. Працяглыя спатканні адміністрацыя магла абмежаваць або пазбавіць іх — усё адбываецца на яе вырашэнне.

> *«...мне вельмі доўга не давалі працяглае спатканне. Кожны месяц пісала заяву на спатканне, мне яе адхілялі па незразумелай прычыне. За ўвесь свой тэрмін я была адзін раз на працяглым спатканні, і тое мне яго далі пасля таго, як я звярнулася да начальніка калоніі і спытала, чаму мне кожны месяц адмову даюць без тлумачэнняў. Агулам парадак такі, што ў цябе раз на чатыры месяцы павінна быць доўгае спатканне. За ўвесь год, што я там была, у мяне было адно.*
>
> *Мне далі спатканне на суткі. І там такое правіла было: для экстрэмістаў, якія прызналі сваю віну, спатканне на двое сутак; хто не прызнаў віну — адны суткі. Але гэта таксама метад ціску».*

Многія з былых асуджаных указвалі на тэндэнцыю: як толькі яны пісалі заяву на спатканне, у іх абавязкова знаходзілася нейкае фармальнае парушэнне і на іх складаўся рапарт — за неахайны знешні выгляд, напрыклад. Атрымаўшы 3 парушэнні, асуджаная становіцца «злоснікам» (зняволены, які парушае ўнутраны распарадак больш за 3 разы). Знаходзячыся ў гэтай катэгорыі, яна аўтаматычна пазбаўляецца вельмі шмат чаго: замест 4-х званкоў на месяц — 1 званок, замест 6-ці базавых велічыняў на краму — толькі 1 базавая велічыня. Акрамя гэтага, асуджаную пазбаўляюць пасылак.

> *«Я бачыла, як дзяўчаткі мучаюцца, колькі гэта нерваў каштуе родным і ўвогуле дзяўчатам атрымаць гэтае спатканне, бо то заявы губляліся, то не падпісваліся, то недзе казалі, што «вы не пісалі нічога». Потым адмяняліся, потым адразу шукалі нагоду, каб скласці рапарт і выклікаць на камісію па пакаранні, каб пазбавіць спаткання.*
>
> *Першыя паўгода мне проста не давалі спатканне. А потым, адразу пасля першага спаткання, у мяне была камісія па пакараннях. Па рашэнні камісіі мяне пазбавілі спатканняў, да канца тэрміна ў мяне больш нічога не было».*

**Перадачы ад сваякоў** асуджаныя могуць атрымліваць раз на 3 месяцы — да 50-ці кілаграмаў, і рэчавыя перадачы — двойчы на год, але толькі ад блізкіх сваякоў. Прычым сродкі гігіены можна было ўкласці толькі ў рэчавыя перадачы.

> *«Я экстрэмістка, якая знаходзіцца ў спісе тэрарыстаў, а гэта значыць, што мне забароненыя грашовыя пераводы. Гэта значыць, што я магу атрымліваць грошы выключна са сваёй працы на фабрыцы. На фабрыцы заробак маленькі, можна здагадацца, я не атрымлівала больш за 25 рублёў* **[прыкладна 7$]** *на рукі. 25 рублёў гэта вельмі добры заробак, часцей за ўсё ты атрымліваеш 5 рублёў* **[прыкладна 1,5$]**. *І вось у цябе ў месяц 5 рублёў, рэчавая перадача прыйшла. А наступная можа быць толькі праз паўгода, і ў цябе заканчваюцца пракладкі. Дзяліцца нельга, набыць у краме ты не можаш. Што рабіць?»*



*Фота: Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталля Качанава ў ПК-4 у рамках працоўнага візіту 5 жніўня 2021 года. Крыніца: belta.by*

# РАБСКАЯ ПРАЦА Ў ЖАНОЧАЙ КАЛОНІІ

## Фабрыка

*«Умовы ўтрымання, праца на фабрыцы* — гэта пекла».*

У ПК-4 жанчыны працуюць на швейнай фабрыцы, якая называецца «Дзяржаўнае прадпрыемства № 4». Згодна з версіяй уладаў, АПК-4 — адзін з вядучых беларускіх вытворцаў спецыяльнага, рабочага і форменнага адзення. «Рэспубліканскае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства №4» знаходзіцца на тэрыторыі жаночай папраўчай калоніі. На сённяшні дзень яно з'яўляецца фабрыкай, якая мае ўсе неабходныя арганізацыйныя падраздзелы для вытворчасці швейнай прадукцыі, пачынаючы з распрацоўкі мадэляў, вырабу ўзораў-эталонаў у вытворчай лабараторыі і заканчваючы серыйнай (масавай) вытворчасцю ў швейных цэхах».**

На фабрыцы існуе некалькі цэхаў, асноўнымі з якіх з'яўляюцца раскройны

---

* Згодна з арт.98 Крымінальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь ад 11.01.2000 N 365-З (далей – КВК) кожны асуджаны да пазбаўлення волі абавязаны працаваць у месцах і на працах, якія вызначаюцца адміністрацыяй папраўчых установаў. Асуджаныя прыцягваюцца да працы ў папраўчых установах, у тым ліку – да працаў па гаспадарчым абслугоўванні і ў вытворчых майстэрнях пазабюджэтных падраздзелаў папраўчых установаў або на прадпрыемствах крымінальна-выканаўчай сістэмы, а таксама на іншых прадпрыемствах, незалежна ад формаў уласнасці пры ўмове забеспячэння належнай аховы і ізаляцыі асуджаных. Пры прыцягненні асуджаных да працы працоўная дамова з імі не заключаецца. Згодна з ч.6 гэтага ж артыкула, адмова ад працы або самавольнае спыненне працы з'яўляюцца злосным парушэннем усталяванага парадку адбыцця пакарання і прыводзяць да ўжывання мераў спагнання.

** https://www.rup4.by/company/

цэх і непасрэдна цэх па пашыве адзення. Усталяваная брыгадная сістэма, кожную брыгаду ўзначальвае брыгадзір, якая таксама з'яўляецца зняволенай. Акрамя гэтага, у цэху працуюць вольнанаёмныя: майстар — прафесійная швачка, якая кантралюе працэс; тэхнолагі, якія распрацоўваюць і вучаць шыць новыя мадэлі; кантралёры, якія правяраюць якасць гатовых вырабаў.

> *«Майстар — гэта чалавек са свабоды. Майстар — гэта, у асноўным, жанчына. ...яны як бы швачкі, я так разумею, па адукацыі, ... яны нічога не шыюць, яны проста сочаць за працэсам».*

Адразу пасля размеркавання ў атрад, пасля каранціну, жанчына накіроўваецца на працу на фабрыку. Ад працы на фабрыцы вызваленыя толькі тыя жанчыны, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту. Спачатку тыя, хто прыбыў, праходзяць працэс навучання, тэрмін якога ўсталяваны фармальна: 3 месяцы для швейнага і 4 месяцы для раскройнага цэха. Аднак, фактычна праз тыдзень ад жанчын патрабуюць паўнавартаснай працы. Да канца вучобы жанчынам прысвойваецца 3-ці разрад. Многія зняволеныя расказвалі, што на фабрыцы было вельмі шмат крыку і прэтэнзіяў, працоўную абстаноўку наўрад ці можна назваць сяброўскай. Многія адзначалі, што працоўныя месцы асуджаных па палітычных артыкулах знаходзяцца ў цэху строга пад камерамі назірання.

> *«Ніхто амаль табой не займаецца, ніхто цябе моцна не вучыць, усе толькі крычаць, кідаюцца ў цябе падачай, могуць рэальна кідацца ў галаву нават. Проста кінуць твой крой, які ты павінна шыць, проста не прынесці, а кінуць і сказаць: «Рабі».*

Палітзняволеныя сядаюць толькі туды, куды іх пасодзяць. Месца, якое павінна добра аглядацца камерай з розных бакоў, каб было бачна, што ты робіш».

На фабрыцы шыюць адзенне для сілавікоў, супрацоўнікаў Следчага камітэту, МНС, ваенных, метрапалітэну, а таксама «кантынгенту» мужчынскіх калоніяў.

> *«Мы міліцэйскую форму шылі, ваенную форму шылі, для ўнутраных войскаў, для КДБ там нейкія курткі былі, потым былі для метрапалітэна кашулі, для мытні былі таксама кашулі, потым для іншых калоніяў таксама, і для нашай, у тым ліку, форма для зняволеных менавіта».*

Праца на фабрыцы ажыццяўляецца ў 2 змены. Першая змена выходзіць на пастраенне а 7 раніцы і пасля праверкі пачынае працоўны дзень а 7:30 раніцы, заканчвае а 14:30. Другая змена выходзіць на пастраенне а 14:30, пачынае працу а 15:00 і заканчвае а 21:30. У кожнай змене ёсць адзін тэх-

нічны перапынак на 10 хвілінаў, а таксама ў першай — перапынак на абед, а ў другой — перапынак на вячэру. На фабрыцы ўсталяваны 6-дзённы працоўны тыдзень.

> *«Вывад на фабрыку — гэта хвілінаў 40 трэба стаяць, туды цябе заводзяць, і вывад з фабрыкі — таксама яшчэ хвілінаў 40, яшчэ могуць абшукваць дадаткова, асабісты дагляд праводзіць».*

У рэальнасці жанчын прымушалі выходзіць на працу ў нядзелю, афармляючы гэта або як навучанне, або як «разнарадку». Пад «разнарадкай» разумеецца выхад на працу па заяве па ўласным жаданні, што на справе часам бывае «добраахвотна-прымусова». Па «разнарадках» жанчыны таксама маглі заставацца на працы пасля завяршэння змены. Многія жанчыны пісалі «разнарадкі» для таго, каб паспрабаваць выканаць норму выпрацоўкі або каб пазбегнуць канфліктаў унутры атрадаў. Для тых, хто стаіць на ўліку па экстрэмізме, выхад у «разнарадкі» быў забаронены, таму прыкрыццём для вываду іх на працу па нядзелях выкарыстоўваецца навучанне. Такім чынам, часцяком працоўны тыдзень доўжыцца 7 дзён, і жанчыны не маюць ніводнага выходнага.

> *«Палітычным былі забароненыя разнарадкі, бо калі яны застаюцца на другую змену працаваць, то яны бачацца з людзьмі з іншай змены. Нельга, каб палітычныя бачыліся адно з адным».*

> *«То бок працоўныя нядзелі аформленыя як добраахвотныя, быццам бы ты подпіс ставіш як добраахвотна, але, як, дапусцім, гэта і з подпісамі ў кандыдаты ў прэзідэнты, так? Гэта твая добраахвотная ініцыятыва, але насамрэч не, на цябе будзе ісці ціск. І гэта вельмі непрыемна. Па паперах усё добра, ты сама пагадзілася пайсці ў гэтую нядзелю працаваць, але не, усе вакол зрабілі вельмі шмат намаганняў, каб ты паставіла гэты подпіс. За адмову ад працы ішлі адразу ж… гэта лічылася сур'ёзным парушэннем, і адразу ж садзілі ў штрафны ізалятар. Калі не хацеў ісці ў штрафны ізалятар, то ты хадзіў на працу нават у нядзелю».*

Вось як намесніца кіраўніка адміністрацыі Лукашэнкі Вольга Чупрыс апісала ўмовы ўтрымання асуджаных у ПК № 4 падчас свайго візіту на фабрыку: «У чымсьці нават на ўзроўні хатніх. Паўнавартаснае харчаванне, залы для заняткаў спортам, творчасцю, самаробкай — зразумела, што няма свабоды, але ўнутры створана ўсё, каб асуджаныя маглі быць здаровымі, развівацца, каб маглі адчуць сябе асобай. Можна вучыцца, атрымаць спецыяльнасць, працаваць». *

* https://news.zerkalo.io/life/59025.html?c



*Фота: Намесніца кіраўніка Адміністрацыі Лукашэнкі Вольга Чупрыс на швейнай вытворчасці ў ПК-4. Крыніца: газета «На страже»*

У той жа час жанчыны расказваюць пра вельмі складаныя ўмовы, у якіх ім даводзілася працаваць. Так, летам — гэта невыносная спякота, зімой — холад. Жанчынам не выдаюць зручнае адзенне і абутак для працы. У цэхах вельмі пыльна, многія тканіны апрацаваныя растворамі, якія выклікаюць алергічную рэакцыю.

> *«Там было цёмна. Для фабрыкі мне хацелася б больш святла, я адчула, што ў мяне панізіўся зрок.*
>
> *Паколькі гэта электрычныя машынкі, па тэхніцы бяспекі павінен быць абутак з гумовай падэшвай абавязкова. Яго нікому не выдавалі.*
>
> *...вельмі пыльна, дыхаць увогуле няма чым. Тканіна ідзе такая з прамочваннямі жахлівымі. Хто алергікі, гэта наогул, хто астматыкі, там настолькі пакутуюць, цяжка вельмі».*
>
> *«Зімой вельмі халодна. У нас неяк быў доўгі перыяд, чамусьці не было ацяплення на фабрыцы, і ўвогуле было вельмі-вельмі халодна. Ты не можаш працаваць у целагрэйцы, таму што гэта не па ўставе, не па форме. І ты нават не можаш на сябе шалік накінуць, напрыклад, таму што гэта парушэнне формы адзення».*

Летам наадварот:

> *«Я працую на пыльнай фабрыцы, тэмпература ў якой 40 градусаў. Я потная, мокрая, брудная, пыльная і я не маю магчымасці памыцца, таму што за мыццё не ў лазневы дзень складаецца рапарт».*

Пры гэтым нормы выпрацоўкі высокія. Увесь працэс вытворчасці вырабу падзелены літаральна на секунды, і кожная жанчына павінна выканаць сваю норму, што практычна немагчыма. Ад выпрацоўкі кожнай жанчыны залежыць выпрацоўка ўсёй брыгады, а значыць і заробак. Пры гэтым абсталяванне на фабрыцы ў асноўным старое і ўвесь час ламаецца.

> *«Трэба шыць хутка і якасна, інакш на цябе крычаць, злуюцца. Калі нешта там зрабіў брак, на цябе могуць напісаць рапарт і ШІЗА.*
>
> *Нормы, вядома, увогуле незразумелыя, з чаго яны, з якіх ... Яны патрабавалі, хаця б 60. Я кажу, дык вы сядзьце, паспрабуйце! Проста толькі вось гэтыя там тры з паловай тысячы разоў проста падняць-апусціць лапку».*

Таксама многія жанчыны адзначалі жудасны стан прыбіральняў на фабрыцы: без кабінак, разбітыя, жудасна пахнуць. Калі прыбіральні не працавалі, то на фабрыцы не было і вады, што не дазваляла ні папіць, ні памыць рукі, а ў прыбіральню жанчыны хадзілі на вуліцу. Калі ў калонію прыязджала праверка, то жанчынам увогуле забаранялі хадзіць у прыбіральню.

> *«Вельмі часта на фабрыцы не працавала прыбіральня. Яна зачынялася, і мы хадзілі за тэрыторыю фабрыкі, у прыбіральню на вуліцу. ... у прыбіральню схадзіць было проста немагчыма і тое ж самае тычылася пітной вады, пітныя фантанчыкі яны былі. Але калі не працавала прыбіральня, не працавала і пітная вада.*
>
> *О, я памятаю наагул выдатна: калі праверка прыязджае, вы нікуды не можаце ўстаць наогул, а самае выдатнае — тое, што зачыняюць прыбіральню. Ты там сядзі, хоць абсікайся, ты не можаш схадзіць у прыбіральню».*

Падобныя ўмовы рабскай працы, стомленасць, старое зношанае абсталяванне, невыканальныя нормы выпрацоўкі спрыяюць траўматызму на фабрыцы. Аднак вытворчыя траўмы афармляюцца ў выключных выпадках — пры сур'ёзных калецтвах. У іншых сітуацыях жанчын нават не адвозяць у бальніцу для атрымання кваліфікаванай медыцынскай дапамогі, ім не выдаецца бальнічны і яны працягваюць працаваць з атрыманай траўмай.

> *«Мяне праводзілі ў кабінет, дзе сядзяць майстры. Майстры мне апрацоўвалі перакісам. Замазвалі леваміколь, з антыбіётыкамі мазь, і пластыр давалі заляпіць і ўсё. І я далей ішла працаваць».*

*«...праз тое, што цябе ўсе прыспешваюць, яшчэ крычаць і неадэкватная псіхалагічная абстаноўка, можна сабе прашыць палец. І такое не раз было, як людзі прашывалі, а потым гэтыя выпадкі спрабуюць замяць, нібыта гэта не траўма на вытворчасці.*

Па-першае, машынкі старыя, дабітыя, абсталяванне жудаснае. Там вельмі шмат няшчасных выпадкаў. Пры мне жанчына за тыдзень да вызвалення сабе адрэзала тры пальцы раскройнай машынай».

Узровень заробку ў калоніі нікчэмна малы. Жанчыны распавядаюць, што здольныя былі выканаць толькі 30-40% выпрацоўкі. Толькі калі жанчыны бяруць «разнарадкі», што не даступна для палітычных зняволеных, і працуюць звышурочна для выканання неабходнай выпрацоўкі, іх узровень заробку дасягае трохзначнай лічбы. Але з заробку ўтрымліваецца 75% на іх утрыманне, а калі ў жанчыны ёсць аліментныя абавязкі, то ўтрымліваецца яшчэ 20%, то бок агулам 95%.

*«У нейкі момант у мяне атрымалася каля 140 рублёў* **[прыблізна 42$]** *за месяц і для мяне гэта быў асабісты рэкорд. І я атрымала з гэтага 25-30 рублёў* **[прыблізна 7-9$]**. *Некалькі месяцаў у мяне такі заробак быў».*

*«У раскройным цэху ён вышэйшы, чым у швейных цэхах. Там залежыць ад адсотку. У мяне, па-мойму, самы маленькі — гэта быў 40 рублёў* **[прыблізна 12$]**, *а самы вялікі — гэта быў, па-мойму, 119* **[прыблізна 36$]**, *калі я не памыляюся. Гэта менавіта тое, што пералічвалася на рахунак».*

*«Мой першы квіток аб заробку быў 0,44 капейкі беларускага рубля* **[прыблізна 0,13$]**. *У наступныя месяцы заробак быў крыху больш. Часам нават даходзіла да 2 ці 3 рублёў беларускіх* **[прыблізна 0,6-0,9$]***».*

## Прыборка тэрыторыі, плуг, дзяжурствы

***«Па самаабслугоўванні абсалютна ўсё. Яны ж вельмі ганарацца тым, што калонія ўвогуле выбудаваная на самаабслугоўванні».***

Згодна з артыкулам 101 КВК, асуджаныя да пазбаўлення волі могуць прыцягвацца да выканання працаў без аплаты працы толькі па калектыўным самаабслугоўванні, у тым ліку, па прыбіранні і добраўпарадкаванні па-



*Фота: Зняволеныя ў ПК-4 на адкрыцці рэабілітацыйнага цэнтру ў чэрвені 2021 года. Крыніца: скрыншот відэа ТРК «Гомель»**

праўчых установаў і прылеглых да іх тэрыторыяў. Да пазначаных працаў асуджаныя прыцягваюцца ў парадку чарговасці ў вольны ад працы час. Працягласць працаў не павінна перавышаць 14 гадзінаў на тыдзень.

Акрамя працы на фабрыцы за капейкі, жанчыны вымушаныя выконваць розныя гаспадарчыя працы, пералік якіх вельмі вялікі. Часцяком у асуджаных проста не застаецца ніякага вольнага часу, і яны, адпрацаваўшы 7 гадзінаў на фабрыцы, потым да адбою выконваюць іншыя абавязкі, якія ўскладаюцца на іх адміністрацыяй. Вельмі часта абавязковыя працы перавышаюць максімальна ўсталяваныя законам 14 гадзінаў. Парадак дзяжурстваў і выканання іншых абавязковых працаў пабудаваны ў розных атрадах па-рознаму, што ўносіць дадатковы стрэс і нязручнасці пры перамяшчэнні паміж атрадамі, якое часта практыкуецца ў дачыненні да палітычных зняволеных.

> *«І, натуральна, зімой гэта пераходзіла за 14 гадзінаў, таму што гэта снег, і ты ўвесь той час, што не знаходзішся на фабрыцы, знаходзішся на вуліцы і прыбіраеш гэты снег.*

Але яшчэ ў кожнага атрымліваецца свой дадатковы расклад дзяжурстваў. Дзяжурствы там усяго на свеце, па ўсім: па брамцы, па стале — гэта на калідоры трэба сядзець дзве гадзіны. Па тым жа калідоры, ПУР, прыбіральнях, потым яшчэ трэба хадзіць абавязкова ў клуб, на промку абавязкова трэба кожны дзень хадзіць, лакалку таксама прыбіраць. ... ты ўвесь час недзе бяжыш... А яшчэ прыбіранне па секцыі».

* https://news.zerkalo.io/life/45480.html?c

Графікі дзяжурстваў складаюцца, як правіла, заггасам атрада. Падыходы да складання графікаў у розных атрадах адрозніваюцца. Так, у большасці атрадаў дзяжурствы размяркоўваюцца па чарзе паміж усімі зняволенымі, то бок, напрыклад, дзяжурства па прыбіранні прыбіральні па чарзе нясе кожная зняволеная з атраду. Аднак, у некаторых атрадах адзін з відаў дзяжурстваў даручаўся адной зняволенай і яна ўвесь час павінна была дзяжурыць, напрыклад, па прыбіральні.

Існуюць наступныя віды дзяжурстваў:

1. дзяжурства па брамцы (доўжыцца 1 гадзіну на дзень, жанчына стаіць каля брамкі на ўваходзе ў лакальны ўчастак, фіксуе і рапартуе ўсім пра перамяшчэнні зняволеных у атрадзе);
2. дзяжурства па стале (доўжыцца 2 гадзіны на дзень, жанчына сядзіць за сталом на ўваходзе ў атрад, адказвае на званкі, фіксуе перамяшчэнні зняволеных і рапартуе пра іх супрацоўнікам);

> *«Калі на брамцы падыходзіць хто заўгодна ў форме, ты абавязаны са сваёй таблічкі распавесці: «Добры дзень, у атрадзе такім-та ўтрымліваецца столькі-та чалавек, на дадзены момант там столькі-та там-та, там-та, там-та, там-та». Акрамя промкі, дзяжурствы на брамцы. Гэта кожны тыдзень, атрымліваецца, на брамцы быў пост стаяць па гадзіне».*

3. дзяжурствы па прыбіранні прыбіральняў, рукамыйнікаў, калідора, кухні, капцёркі, ПУР, секцыі, пад'ядальнай, целагрэечнай.

> *«... дзяжурства па прыбіральні. Ты не павінен з гэтай прыбіральні, у прынцыпе, вылазіць ніколі. То бок ты яе павінен драіць, драіць, драіць і драіць.*
>
> *І палітычныя нейкім чароўным чынам дзяжураць больш за астатніх. Таму, калі чалавек трапляе ў атрад, паколькі ён навенькі, на яго навешваюцца ўсе віды дзяжурстваў».*

4. дзяжурства па бялізне (заключаецца ў дастаўцы бялізны на пранне і назад);
5. дзяжурства па абіранні бульбы і гародніны.

> *«Вось у 9-м атрадзе, дзе я была апошнія паўгода, аператыўны супрацоўнік Кузняцоў усталяваў такія правілы, што тыя, хто стаіць на прафуліку па экстрэмізме, ходзяць незалежна ні ад чаго на ўсе абіранні бульбы, морквы, цыбулі. Бывала такое, што 3 дні запар мы абіраем бульбу з цыбуляй.*

Бывала, што мы 80 мяхоў бульбы павінны былі абабраць. Ну, там нас ідзе чалавек 20, за пару гадзінаў мы павінны вельмі хутка ўсё гэта абабраць тупымі нажамі».

Адной з самых складаных абавязковых працаў жанчыны называюць «промку» — прыбіранне прамысловай зоны. За кожным атрадам замацаваная асобная тэрыторыя вуліцы калоніі, дзе яны павінны падтрымліваць чысціню і парадак — прыбіраць лісце, снег, змятаць пыл. Асабліва цяжка даводзіцца зімой, калі жанчыны ўвесь час колюць лёд, прыбіраюць снег, носяць цяжкія мяхі са снегам па ўсёй тэрыторыі. Часта ўказанні адміністрацыі выглядаюць проста як здзек. Жанчыны прыбіраюць лужыны анучамі, цягаюць цяжкія мяшкі са снегам з месца на месца. Прыбіранне снегу складаецца ў збіранні яго ў мяшкі, якія зняволеным не выдаюць (ім даводзіцца іх самастойна шыць і ўпрошваць дазволіць вынесці іх з фабрыкі, а калі дазвол не даюць, то снег даводзіцца прыбіраць ва ўласную пасцельную бялізну). У мяшках снег пераносіцца ў спецыяльна вызначаныя месцы, дзе фармуюцца снежныя горы. За разгледжаны перыяд мяняўся падыход да магчымасці прыцягнення да дадзеных працаў асуджаных, якія стаяць на ўліку па экстрэмізме: ім то забаранялі даручаць прыбіранне прамысловай зоны, то дазвалялі зноў.

> *«… На што ДПНК Янчанка паведаміў пра тое, што цяпер снег не падае, навошта вам мяхі. І не дазволіў нам забраць мяхі для смецця. А на наступны дзень выпаў снег. І снег мы насілі ва ўласных коўдрах, у якіх спім, пад якімі спім, якімі накрываемся ўначы».*
>
> *«Мне ўжо проста, калі я расплюшчвала вочы зранку і бачыла ў вакно, што ідзе снег, хацелася равець. Гэта вельмі цяжкая фізічная праца, прам сапраўды цяжкая фізічная праца.*
>
> *То бок ідзе дождж — мы прыбіраем дождж. Ідзе снег — мы прыбіраем снег. Не павінна быць ніводнай сняжынкі. Усё гэта прыбіраецца да асфальту. Тыя асуджаныя, якія даўно адбывалі пакаранне, да прыкладу, па наркотыках, якія сядзелі па 6-10 гадоў, казалі, што ніколі такога не было, што гэта толькі з'явілася зараз, калі прыйшлі палітычныя».*

Жанчыны, якія выконваюць невялікі адсотак выпрацоўкі на фабрыцы, таксама прыцягваюцца да выканання інвентарных працаў. У кожнага атрада на месяц ёсць 3 інвентарныя дні, калі заггас калоніі прыцягвае жанчын-інвентаршчыц да выканання сваіх даручэнняў — перанесці мэблю, бярвенне і іншае. Акрамя таго, жанчыны пастаянна прыцягваюцца да выканання пагрузачна-разгрузачных працаў, падчас якіх носяць цяжкія мяшкі з буль-

бай, гароднінай, пераносяць ложкі, мэблю. Пры гэтым адміністрацыя папраўчай установы цалкам ігнаруе ўсталяваныя гранічныя нормы пад'ёму і перамяшчэння цяжараў жанчынамі ўручную, усталяваныя Пастановай Міністэрства аховы здароўя ад 13 кастрычніка 2010 г. N 133:

| Характар працы | Гранічна дапушчальная маса грузу <*> |
|---|---|
| Пад’ём і перамяшчэнне цяжараў пры чаргаванні з іншай працай (да 2 разоў на гадзіну) | 10 кг |
| Пад’ём і перамяшчэнне цяжараў увесь час на працягу працоўнай змены | 7 кг |
| Сумарная маса грузаў, якія перамяшчаюцца на працягу кожнай гадзіны змены: | |
| с рабочей поверхности | До 350 кг |
| с пола | До 175 кг |

*«Калі ў вас інвентарны дзень, то ў любы момант можа прыйсці ў атрад заггас калоніі і сказаць, што мне трэба там 15 чалавек, каб насіць сталы ці насіць бярвенне.*

*...вось прывозяць 120 мяхоў бульбы. Машына цэлая. І ўсе становяцца ў шэраг і пачынаюць гэта ўсё выгружаць. Хтосьці залазіць наверх, скідае гэтыя мяшкі, апускае, і ўсе астатнія цягнуць усё гэта».*

Яшчэ адным відам працаў, да якіх прыцягваюцца зняволеныя, за выключэннем тых, хто стаіць на ўліку, з'яўляецца прыбіранне і рыхленне кантрольна-следавой паласы (КСП). Кантрольна-следавая паласа — гэта прамежак зямлі паміж трыма шэрагамі платоў, якія агароджваюць калонію. КСП павінна быць заўсёды ўзрыхленая, каб калі нехта пройдзе, то засталіся сляды. Рыхленне зямлі на КСП адбывалася з дапамогай інструмента, які супрацоўнікі называлі «машка». Гэты інструмент нагадвае невялікі плуг. Жанчыны былі вымушаныя «запрагацца» ў яго, як коні, і рыхліць зямлю.

*«Туды ўвогуле за плот не павінны трапляць зняволеныя. Раз на месяц кожны атрад ходзіць на кантрольна-следавую паласу, ім даюць прыладу, каб араць зямлю... Не, не граблі. Такая штука, у якую запрагаешся, і яна рыхліць зямлю.*

*Запрагалі звычайных людзей і прымушалі, як конь, ісці з гэтым плугам на шыі. Уласна, яны такім чынам і здзекаваліся, і пры гэтым выконвалі сваю працу, тое, што павінны выконваць яны».*

# Медыцынскае абслугоўванне

***«Медсанчастка не саступае гарадскім паліклінікам: тут ёсць усё неабходнае для лячэння — ад сучасных УГД-апаратаў да стаматалагічнага кабінета, а таксама палаты для стацыянарнага лячэння».****

Нягледзячы на захапленне медсанчасткай прапагандысцкага выдання, былыя зняволеныя расказваюць пра шэраг праблемаў з атрыманнем медыцынскай дапамогі. У калоніі існуе выдача медыцынскіх прэпаратаў, дзе можаш атрымаць таблеткі, выпісаныя табе лекарам. Таксама тэрміновую медыцынскую дапамогу надаюць фельчары і дзяжурныя лекары, аднак, улічваючы шчыльны графік асуджаных, патрапіць да іх праблематычна. Фельчары выдаюць экстраныя прэпараты ад прастуды, абязбольваючыя, без тлумачэння, якія менавіта гэта таблеткі, не высвятляючы магчымасць алергічных рэакцыяў, а часцяком адмаўляючы ў выдачы абязбольваючых без прызначэння лекара, прыёму ў якога трэба чакаць тыднямі.

*«Да тэрапеўта ў мяне атрымалася патрапіць толькі праз паўтара тыдні, і за гэты час у мяне пачаўся бранхіяльны кашаль такі, што я спалохалася, што ў мяне астма».*

*«Вось ён цяпер баліць, ці у мяне цяпер месячныя, ці мне трэба да лекара. Адказ: «Я не магу без рэцэпту вам выдаць таблетку». … ты з гэтым болем ідзеш і стаіш на праверцы паўгадзіны, потым ты з гэтым болем ідзеш на інвентарную працу, а потым ты з гэтым жа болем фігачыш снег».*

Многія жанчыны адзначаюць абыякавае стаўленне да сваёй працы фельчараў. Прыём у вузкіх спецыялістаў чакаюць месяцамі. Медыцынскія прэпараты захоўваць у сябе зняволеным забаронена, і для іх атрымання ўвесь час неабходна прыходзіць у медыцынскую частку ў суправаджэнні. У выходныя дні лекары ў калоніі адсутнічаюць, і ёсць толькі выдача прэпаратаў. Калі жанчыне становіцца дрэнна на фабрыцы, то рашэнне пра тое, адводзіць яе ў санітарную частку ці не, прымае брыгадзір і майстар. Вельмі часта гэтыя некампетэнтныя супрацоўнікі адмаўляюць жанчынам у атрыманні медыцынскай дапамогі, і яны вымушаны працягваць працу.

*«То бок, іх абсалютна не клапоціць жыццё і здароўе тых, да каго яны ідуць. Ну, я столькі разоў бачыла гэтую фрывольную такую хаду і столькі разоў задавала сабе пытанне: «Ну, чувак,*

---

* З інтэрв'ю з былой начальніцай ПК №4 Святланай Паходавай «Папраўчая калонія № 4 – ад мары да мары», https://kvb.by/rubric/obschestvo/ispravitelnaya-koloniya-n-4-ot-mechty-do-mechty

*цябе выклікалі тэрмінова, чалавек без прытомнасці ляжыць». А яны… ім пляваць, абсалютна пляваць».*

*«У сярэдзіне студзеня ў мяне здарыўся вельмі моцны астматычны прыступ, гэта была субота, то бок лекараў не было ў санчасці. Я разумела, што дапамогу мне ніхто не надасць».*

*«У іншыя разы ўжо калі становіцца дрэнна на працы, яны адмаўляюцца выводзіць. Яны лічаць, што галава баліць — гэта не сур'ёзна, што ты прыкідваешся, што можна працаваць. То бок ніяк, каб яны адвялі да лекара з працы, гэта трэба ўжо проста ўпасці».*

На жанчын ціснулі і прымушалі рабіць прышчэпкі ад COVID, пры гэтым жанчынам пагражалі пазбаўленнем спатканняў, перадачаў. Асуджаныя расказваюць, што многія адчувалі сябе дрэнна пасля расійскай вакцыны «Спутнік», аднак ніхто не вызваляў іх ад працы, а прапушчаны праз прышчэпкі паход у лазню ім не кампенсавалі. Некаторыя жанчыны 2 тыдні не мелі магчымасці памыцца.

*«І прычым прышчапілі ўсіх «Спутнікам». І гэта дастаткова цяжкая вакцына, і ўсім прам было дрэнна на наступны дзень. … Хоць пры гэтым ніякага нават пасцельнага рэжыму ім не прызначылі».*

*«…у гэты ж дзень прапаноўвалі зрабіць прышчэпку ад кавіду, таксама з такой фармулёўкай, што калі ты адмаўляешся, то ніякага спаткання ты не атрымаеш, і як бы праблемы з пасылкамі таксама ў цябе будуць вялікія».*

Нягледзячы на дрэннае самаадчуванне, бальнічныя выдаюць у выключных выпадках. Жанчыны працягваюць хадзіць на фабрыку і выконваць абавязковую працу — насіць снег, мяшкі з гароднінай, дзяжурствы. Некаторыя асуджаныя адзначаюць, што да палітычных зняволеных было асаблівае стаўленне, і ім асабліва часта адмаўлялі ў выдачы бальнічных.

*«Ты прыходзіш туды, ты з жоўтай карткай, і нават калі ў цябе там тэмпература 37,7, то гэта нармальна, ты цалкам гатовы ісці на фабрыку, цягаць снег і рабіць усё, што заўгодна».*

*«У лекара ляжыць паперка ад аператыўнікаў, таму што … не прызнае віну, … бальнічны не даваць. Натуральна, нягледзячы на тое, што я паміраю, у мяне тэмпература, я захварэла, у мяне кашаль, я знясіленая, у мяне няма фізічных сілаў хадзіць*

*на фабрыку і працаваць, мне ўсё адно не даюць бальнічны. Мне прапісваюць антыбіётыкі. Я іду ў медсанчастку, каб атрымаць антыбіётыкі, а мне кажуць, што гэтых антыбіётыкаў няма».*

Па стане здароўя лекар можа ўносіць у карткі зняволеных абмежаванні па працы. Аднак на практыцы гэтыя абмежаванні не выконваюцца і служаць падставай для дадатковых здзекаў з боку адміністрацыі і асуджэння ад іншых зняволеных.

*«...далі як вызваленне ад падняцця цяжару. Але не ва ўсіх атрадах гэта дапамагала, то бок дзесьці мне дапамагала, як бы менш мяне трэціравалі. Я казала, у мяне вось вызваленне, а недзе наадварот, казалі, што «нічога страшнага, не можаш шмат, значыць, бяры ...сталовую лыжку» ... і лыжкай награбай у пакуначак там да трох кілаграмаў і насі пакецікам па тры кілаграмы».*



*Фота: Палітзняволенная журналістка Кацярына Барысевіч пасля выхаду з ПК-4.*
*Крыніца: Праваабарончы цэнтр «Вясна»*

# ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

> ***«Жоўтая бірка — гэта ты ўжо мечаны, табе... шмат чаго нельга».****

> ***«...гэта была нейкая ўказка зверху нас дабіць. То бок, гэта заўсёды былі нейкія хвалі. Самая такая сур'ёзная цяжкая хваля была, калі Воля Гарбунова абвесціла збор грошай. Гэта нейкі марафон быў і нам сабралі паўмільёна даляраў, па-мойму».***

Як расказваюць былыя зняволеныя, практычна ўсіх затрыманых па «палітычным артыкуле» аўтаматычна ставяць на прафілактычны ўлік як «схільных да экстрэмізму і іншых дэструктыўных дзеянняў». Некаторым дадаюць іншыя прафулікі, напрыклад, «схільнага да гвалту да адміністрацыі і захопу закладнікаў», «схільнага да суіцыду і самакалецтва», «схільнага да ўцёкаў» і г.д. Агулам існуе 10 катэгорыяў прафулікаў.**

> *«Прафулік экстрэмісцкі — гэта 10-ты прафулік. Адпаведна, ёсць нейкія яшчэ 9, ну, як мінімум, можа быць і больш. Ёсць суіцыднікі, схільныя да нападу, схільныя да ўцёкаў, схільныя... да ўсяго на свеце схільныя».*

* https://baj.media/ru/verh-cinizma-ekskursiyu-po-ik-17-propagandistam-s-belarus-1-provodil-eks-zhurnalist/
** https://spring96.org/ru/news/107768

Прафілактычны ўлік не прадугледжаны крымінальна-выканаўчым кодэксам і рэгулюецца выключна ўнутранымі дакументамі, якія адсутнічаюць у адкрытым доступе і не даюцца зняволеным для азнаямлення. Таму дакладных правілаў пастаноўкі на прафулік няма. На практыцы на ўлік па экстрэмізме ставяць усіх палітычных зняволеных, асабліва асуджаных за ўдзел у групавых дзеяннях, што груба парушаюць грамадскі парадак, удзел у масавых беспарадках і за такія артыкулы як абраза прадстаўніка ўлады, абраза прэзідэнта, распальванне варожасці, злоснае хуліганства.

> *«Па тых артыкулах, якія відавочна былі за «палітыку», ставілі на прафулік не ў калоніі, а яшчэ ў следчым ізалятары».*

Усе жанчыны, якія стаяць на прафілактычным уліку, павінны насіць жоўтую бірку на форменным адзенні. Такім чынам, кожная асуджаная і кожны супрацоўнік здалёку бачаць, да каго трэба ставіцца па-асабліваму. Гэтыя жоўтыя нашыўкі таксама яшчэ адзін спосаб знайсці парушэнні: перыядычна правяральнікі з лінейкамі вымяралі гэтыя нашыўкі і іх размяшчэнне на адзенні, каб выявіць неадпаведнасці патрабаванням.

> *«Справа ў тым, што вельмі часта менавіта да «палітыкі» прыходзілі правяралі нашыя знакі, як яны прышытыя. То бок, там ёсць нейкі стандарт, дапусцім, 10 сантыметраў ад пляча павінна быць. Яны прыходзілі з лінейкай, калі што, яны проста яго адрывалі, прымушалі перашываць».*

Апроч пастаноўкі палітычных зняволеных на прафілактычны ўлік, існуе градацыя па ступені іх значнасці і заўважнасці. Так, найбольш вядомыя палітычныя зняволеныя знаходзяцца пад вялікім кантролем і ціскам. Такіх, а таксама тых, хто адмаўляецца ад супрацоўніцтва, ад прызнання віны і іншых дзеянняў, якія патрабуюцца ад іх адміністрацыяй, змяшчаюць у так званыя прэс-атрады. Такімі ў ПК-4 лічацца 9-ты і 18-ты атрады. Іх спецыфіка ў тым, што зняволеныя, якія знаходзяцца там, пастаянна сочаць адно за адным і паведамляюць адміністрацыі пра любыя парушэнні, а таксама пастаянна правакуюць або нават падстройваюць парушэнні. Таксама зняволеныя выдзяляюць 3-ці атрад, аператыўным супрацоўнікам якога з'яўляецца Чорны. Складанасці знаходжання там звязаныя з выбудаванай Чорным сеткай інфарматараў і правакатараў.

> *«Яна патрапіла ў прэс-атрад, 9-ты атрад, дзе выліваlі палітычным ваду на ложак, лёзы ўстаўлялі. І гэта было не да ўсіх, толькі вось на каго ёсць замова… гэтая дзяўчынка таксама не прызнавала сваю віну і таксама атрымала праз гэта».*

> *«… гэта самы жорсткі атрад, калі вось можна патрапіць у пекла, то гэта менавіта тое месца [пра 9-ты прэс-атрад]».*

*«Наколькі я ведаю, першапачаткова там 18-ты атрад лічыцца такім, ну, прэс-атрадам. … з указання супрацоўнікаў зверху шмат асуджаных па замове падстаўляе нашых дзяўчатак».*

Зняволеныя, якія стаяць на прафілактычным уліку, маюць шэраг абмежаванняў і асаблівых умоваў адбыцця пакарання. Так, у сектары ім выдзяляецца ложак на верхнім паверсе ў праходзе насупраць дзвярэй, каб іх заўсёды было добра відаць. На ўсіх пастраеннях і праверках яны стаяць у першым шэрагу. Рэчы ім дазваляюць захоўваць толькі на верхніх паліцах у капцёрцы, што стварае шэраг сур'ёзных нязручнасцяў.

*«Гэта тыпу быў першы ярус стэлажа, то бок ён знаходзіцца прама пад столлю, і гэта вельмі нязручна. Вельмі нязручна туды лазіць, таму што для гэтага табе трэба выкарыстоўваць драбінкі, лесвіцу. Пры тым, што звычайна на вось гэтым 5-м ярусе, там ніхто не жыве, акрамя палітычных».*

Апроч дзвюх праверак на дзень, для палітзняволеных існуе яшчэ дзве дадатковыя праверкі, а гэта значыць, што яшчэ больш часу яны праводзяць на вуліцы на праверках у любое надвор'е. Пры гэтым адміністрацыя забараняе зняволеным з біркамі размаўляць адно з адным. Акрамя таго, у тых, хто стаіць на ўліку па экстрэмізме, часцей чым у іншых зняволеных і ў больш грубай форме праводзяцца вобшукі.

*«Па правілах унутранага распарадку прапісана, што ў дрэннае надвор'е, пры адмоўных тэмпературах, пры вельмі нізкіх тэмпературах праверкі праводзяцца ў будынку. Гэтае правіла наогул не дзейнічала».*

*«І вось са мной у атрадзе была адна палітычная, але нам забаранялі з ёй камунікаваць, проста забаранялі пад страхам пакарання».*

Зняволеным на ўліку забаронена хадзіць у клуб, спартовую залу, царкву, каледж, на прыбіранне КСП. Часам уводзіліся забароны і на прыбіранне прамзоны. Таксама магчымасць патэлефанаваць ім давалася толькі раз на месяц і ў прысутнасці начальніка атрада, а часам і аператыўнага супрацоўніка. Працяглыя спатканні даюцца не больш як на 2 дні без вынасу (магчымасць узяць ежу, якая засталася са спаткання). Таксама палітычным максімальна абмяжоўваюць магчымасць перапіскі, выдаючы лісты толькі ад самых блізкіх сваякоў.

*«Плюс табе нельга, напрыклад, хадзіць у клуб, плюс ты не можаш наведваць каледж, у спартзалу таксама нейкі час нельга было хадзіць».*

*«...табе набіраюць нумар, і сядзіць начальніца атрада і слухае. Але не толькі начальніца атрада, першы час яны пастаянна клікалі аператыўных супрацоўнікаў».*

Палітычныя зняволеныя часта атрымліваюць спагнанні, а заахвочвальныя рапарты для іх немагчымыя. Як немагчымае і прызнанне іх тымі, хто стаў на шлях выпраўлення, што з'яўляецца абавязковай умовай пераводу на лепшы рэжым, або замены пакарання, або ўмоўна-датэрміновага вызвалення.

*«...не было яшчэ ні разу прэцэдэнтаў, каб хтосьці атрымаў заахвочвальны рапарт, то бок мне здаецца, што ў выпадку, калі ў цябе палітычны прафулік, гэта агулам немагчыма.*

*Але яшчэ такі момант, напэўна, самы, мы не можам стаць на шлях выпраўлення наагул ніяк».*

Былыя палітвязынкі адзначаюць, што аператыўныя супрацоўнікі прыкладалі шмат намаганняў, каб стварыць атмасферу падазронасці і недаверу сярод палітычных зняволеных. Яны настойліва схілялі да супрацы і давалі зразумець, што ўсе астатнія ўжо пагадзіліся на гэта. У той жа час для звычайных зняволеных «настукаць» на палітычнага — асабліва каштоўна, бо іх за гэта добра ўзнагароджваюць.

*«Таксама ён мне сказаў: «Ты такая сумленная і такая наіўная, вось будзеш вызваляцца, я табе пакажу запісы і даведаешся, колькі тваіх сяброўак насамрэч расказваюць усё і дзеляцца ўсім, і выдатна сябе адчуваюць». Спойлер: ніякіх запісаў мне не паказалі.*

*Нас было вельмі складана развесці на супрацу. Ну, то бок даходзіла да таго, што мне пагражалі, што падоўжаць тэрмін. Ёсць такі артыкул 411 — да года».*

# ПАРУШЭННІ І ПАКАРАННІ

***«Цэнтр Еўропы, 21-е стагоддзе, а людзей саджаюць у клетку пад адкрытым небам, як жывёлаў».***

Згодна з артыкулам 112 КВК, за парушэнне ўсталяванага парадку адбыцця пакарання да асуджаных да пазбаўлення волі могуць ужывацца наступныя меры спагнання:

1. вымова;
2. пазачарговае дзяжурства па прыбіранні памяшканняў або тэрыторыі папраўчай установы;
3. пазбаўленне права на атрыманне чарговай пасылкі ці перадачы;
4. пазбаўленне чарговага працяглага або кароткатэрміновага спаткання;
5. навядзенне асуджаных, якія ўтрымліваюцца ў папраўчых калоніях і турмах, у штрафны ізалятар з вывадам або без вываду на працу або вучобу на тэрмін да пятнаццаці сутак;
6. перавод асуджаных, прызнаных злоснымі парушальнікамі ўсталяванага парадку адбыцця пакарання, у памяшканні камернага тыпу на тэрмін да шасці месяцаў.

# Камісія

Згодна з часткай 4 артыкула 113 КВК, спагнанні накладаюцца пастановамі службовых асобаў папраўчых установаў, якія маюць права накладаць спагнанні.

Заканадаўства не ўтрымлівае паняцця «камісія па пакараннях», аднак на практыцы рашэнне пра пакаранне прымаецца менавіта такімі камісіямі. У склад камісіі ўваходзяць начальнік калоніі, аператыўныя супрацоўнікі, начальнік папраўчага працэсу, псіхолаг, начальніца атрада, у дачыненні да зняволенай якога разглядаецца рапарт. Да таго, як збіраецца камісія, на зняволеную складаецца рапарт за парушэнне і ў яе бяруцца тлумачэнні.

> *«О, камісія па пакараннях — гэта наагул асобная тэма. Там засядае начальнік калоніі, усе ягоныя набліжаныя, і пачынаецца шоу, «Ды ты такая, ты сякая, ды згнаіць цябе трэба».*

Часта чальцы камісіі выкарыстоўваюць псіхалагічны ціск і пагрозы на адрас жанчын. Спробы абараніцца, як правіла, успрымаюцца агрэсіўна. За адно і тое ж парушэнне некаторыя жанчыны атрымліваюць проста адзнаку аб праведзенай гутарцы, а некаторыя адразу накіроўваюцца ў ШІЗА.

> *«І ўжо начальнік калоніі мне такі: «Вы разумееце, што вы ў нас упэўненым крокам ідзяце да злосніка? Вы разумееце, што наступнае вашае пакаранне будзе ўжо толькі штрафны ізалятар? Ужо міма штрафнога ізалятара не пройдзеце». Алёхін сядзіць, кажа: «Вы ж разумейце, што ўсё пра вас вядома, кожны крок вядомы. У нас жа такія камеры. Мы ж за вамі за ўсімі сочым».*

Пры разглядзе рапарта на камісіі станоўча ацэньваўся факт прызнання віны зняволенай і напісанне ёю заявы на памілаванне. Таксама адной з жанчын ад начальніка калоніі паступала прапанова зняцца ў відэа на палітычную тэму.

> *«І я памятаю, што ў гэты момант выказалася гэтая начальніца выпраўпрацэсу, з-за якой я і напісала гэтую дурную, блін, памілаўку. Яна кажа: «Так, усё нармальна, яна напісала памілаўку, усё окей». І начальнік калоніі: «Ну ладна тад. І, карацей, мой прысуд па гэтым рапарце быў... ён гучыць як «абмежавалася гутаркай»».*

> *«Яшчэ на камісіі начальнік калоніі нейкія вельмі дзіўныя таксама рабіў намёкі: «А ці не хочаш ты зняцца ў відэа?»*

*«Тым хто не пажаданы, калі ёсць нейкі загад зверху, то яны ставяць метку «злосны парушальнік». Гэта значыць, пазбаўленне шматлікіх выгодаў… То бок табе ставяць спачатку «злоснага парушальніка», а потым … калі яны захочуць падоўжыць тэрмін, у нас у законе ёсць выдатны артыкул пад нумарам 411… Гэта гумовы артыкул, то бок першая частка, яна да года, але часцей за ўсё ставяць адзін год, другая частка да двух гадоў. І так яны могуць хоць кожныя паўгода зноў, зноў і зноў … падаўжаць тэрмін утрымання ў калоніі да бясконцасці».*

## Парушэнні

Пералік парушэнняў, за якія зняволеныя могуць атрымаць спагнанне, вельмі шырокі. Прычым ствараюцца такія ўмовы, у якіх не дапусціць парушэнняў вельмі складана, калі немагчыма. Але ў той час як на такія парушэнні ў звычайных зняволеных могуць заплюшчыць вочы, для палітычных зняволеных адміністрацыя выкарыстоўвае кожную магчымасць накладання спагнання. Калі парушэння няма, то яго могуць проста прыдумаць. Давесці ж сваю невінаватасць немагчыма.

*«Дзяжурства на брамцы… Заггас, такая ўжо шасцёрка, якая ў змове з таварышамі міліцыянтамі, кажа: «… табе вось прам зараз трэба ісці на званкі, бо ўжо адтэлефаноўваюць вашых палітычных, замест цябе пастаіць там, умоўна, Каця». Я як бы нічога не падазраючы пайшла на гэтыя званкі. А на наступны дзень да мяне падыходзяць і прад'яўляюць: «… сышла з дзяжурства»… Ну і ўсё, добры дзень, новы рапарт у мяне. Я стала злоснікам…»*

На зняволеных складаюць рапарты за размовы ў пастраенні, адлучку з дзяжурства, захоўванне пратэрмінаваных лекаў або пратэрмінаваных лекаў, захоўванне забароненых рэчаў або рэчаў, якія не лічацца ў тваім вопісе; парушэнне раскладу, выкарыстанне нецэнзурнай лексікі. Таксама часта рапарты складаюцца за парушэнне формы адзення.

*«Абсалютна ўсе размаўляюць у пастраенні, але экстрэмістак за гэта вельмі часта ловяць і даюць парушэнне».*

*«… форма адзення можа быць парушаная не толькі ў выглядзе, ну тыпу там пінжак са спадніцай, а трэба было надзець сукенку з пінжаком, а можа быць, у тым ліку, гузік адкрыты, не зашпіліўся на ўсе гузікі».*

Рэальная прычына пакарання і парушэнне згодна з рапартам не заўсёды супадаюць. Так, калі жанчына робіць нешта, што не падабаецца адміністрацыі, але за гэта яе афіцыйна пакараць немагчыма, то парушэнні ствараюцца штучна аператыўнымі супрацоўнікамі ці з выкарыстаннем зняволеных, якія супрацоўнічаюць з адміністрацыяй.

> *«…я не пабаялася, я падышла пагаварыць з гэтай праверкай і расказаць, што парушаюцца правы і гэтак далей, і які жах там робіцца. Іх суправаджаў начальнік калоніі, ён пачуў усё, што я агучвала. Літаральна праз 10 хвілінаў быў вывад фабрыкі ў атрад, то бок канец працоўнага дня і працоўнай змены, і на дагледзе ў мяне нібыта дастаюць кіпяцільнік з кішэні. У мяне ў кішэні не было ніякага кіпяцільніка, гэта ўвогуле не мой… Я ўласна ў іх і пыталася: «Хлопцы, вы чаго? Што мне не патрэбны кіпяцільнік, што вы такое гаворыце? Гэта не маё»… Зюзін …кажа: «Ах так! У цябе яшчэ і слова «хлопцы» праскочыла! У цябе, значыць, усё… гэта яшчэ адно парушэнне за абразу, што не па форме звяртаешся да супрацоўніка». Вось і тут жа яны прыдумалі нейкае трэцяе, а трэцяе — яны сказалі, што я няправільна чытаю рапарт, то бок там прадстаўляцца трэба неяк па-іншаму. То бок, калі мне сказалі «прадстаўцеся калі ласка!», я заўсёды прадстаўлялася «незаконна асуджанай», а яны сказалі, што гэта таксама парушэнне і пасадзілі мяне ў штрафны ізалятар».*

Адміністрацыя ўсяляк змагаецца з праявай узаемадапамогі і падтрымкі сярод зняволеных. Для гэтага нават існуе тэрмін «сямейніцтва». Любыя дзеянні, накіраваныя на клопат пра іншага чалавека, ці проста сяброўскія адносіны могуць быць падведзеныя да парушэння за гэтае «сямейніцтва». Наданне дапамогі іншым зняволеным таксама забароненае, бо лічыцца выкарыстаннем іншых асуджаных у сваіх карыслівых мэтах.

> *«Прасіць дапамогу, дарэчы, у тым ліку гэта парушэнне. Таму што ёсць пункт правілаў унутранага распарадку… «выкарыстоўваць працу іншых асуджаных у сваіх карыслівых мэтах».*

Тое, што вы разам будзеце адначасова есці, гэта ў тым ліку пры жаданні можа аператыўнікамі інтэрпрэтавацца як сямейніцтва, што з'яўляецца парушэннем».

> *«Рапарт на яе напісалі першы за тое, што яна ў той момант, калі я прыйшла з фабрыкі, мяне пачала супакойваць. Я прыйшла ад опера і яна мяне пачала супакойваць. Склалі рапарт, што яна ў гэты момант мацюкалася».*

Адным з самых распаўсюджаных парушэнняў з'яўляецца так званае «адчужэнне і прысваенне». Пры гэтым дадзенае паняцце трактуецца вельмі шырока і любы факт перадачы рэчы нават у часовае карыстанне падпадае пад парушэнне.

*«І асабліва было здзіўленне майго таты, калі яму на відэазванку кажу: «Я падзялілася марозівам з дзіцем. Гэта былая малалетка, васямнаццацігадовая дзяўчынка. То бок, я зрабіла тое, чаму ты мяне вучыў, тата, я падзялілася. І за гэта мы не ўбачымся 9 месяцаў». На што мой тата сказаў, што ён мной ганарыцца».*

*«Адно спагнанне, што яна дала на абіранні бульбы, гэта абавязковая ў нас працэдура, дзяўчынцы дала пальчатку гумовую, аднаразовую, таму што тая парэзала руку. Вось, адчужэнне-прысваенне. І яна, і гэтая дзяўчынка атрымалі па рапарце».*

## ШІЗА



*Ілюстрацыйнае фота. Крыніца: nashaniva.com*

Адным з самых цяжкіх пакаранняў з'яўляецца змяшчэнне асуджанага ў штрафны ізалятар (ШІЗА). Асуджаным да пазбаўлення волі, змешча-

ным у штрафны ізалятар, забараняюцца працяглыя і кароткатэрміновыя спатканні, тэлефонныя размовы, у тым ліку з выкарыстаннем сістэмаў відэасувязі, набыццё прадуктаў харчавання і прадметаў першай неабходнасці, атрыманне пасылак, перадачаў, бандэроляў і дробных пакетаў, адпраўленне і атрыманне лістоў, карыстанне настольнымі гульнямі і паленне. Пасцельныя рэчы ім не выдаюцца, прагулкі не даюцца.* Асуджаным дазваляецца браць у ШІЗА (ДІЗА) наяўныя ў іх тапачкі, панчошна-шкарпэткавыя вырабы, споднюю бялізну па сезоне, ручнік, зубную пасту, мыла і зубную шчотку ў пластмасавых футаралах, туалетную паперу па адным камплекце (адзінцы)**. Звычайна змяшчэнне ў штрафны ізалятар ужываецца на трэцяе парушэнне, аднак бывае, калі зняволеную змяшчаюць у ШІЗА з першага парушэння.

> *«... у штрафным ізалятары... у мяне нават расчоскі не было. У штрафным ізалятары ў мяне была толькі зубная шчотка, зубная паста, кавалак мыла і туалетная папера. Усё, больш нічога. І строй, які на мне, тоненькі, чувякі яшчэ — абутак».*

Жанчыны апісваюць умовы ў ШІЗА як вельмі цяжкія. Там халодна і немагчыма сагрэцца праз адсутнасць цёплай вопраткі. Само памяшканне складае плошчу каля 3 квадратных метраў і цалкам складаецца з бетону. Па радыёкропцы круцяць прапагандысцкія матэрыялы.

> *«Штрафны ізалятар — гэта вельмі маленькая камера бетонная і вельмі-вельмі халодная, дзіравыя вокны. Ну, не вокны, а вакно. Ты сядзіш усярэдзіне бетону і ты сядзіш на бетоне. І гэтая прыступка бетонная і яна ж ababітая па тарцах жалезам. На жалезе з'яўлялася шэрань ад холаду».*

> *«Потым ты сядзіш і чакаеш. Па радыё табе ўключаюць прапагандысцкія аўдыяролікі і ўвесь час (прычым гэта кожны дзень) прамываюць мозг».*

Нягледзячы на максімальна ўсталяваны тэрмін знаходжання ў штрафным ізалятары ў 15 сутак, на практыцы жанчыны знаходзяцца там даўжэй. Гэта афармляецца як новае парушэнне.

> *«На той момант, калі я была ў калоніі, рэкорд быў у [імя] каля 30 сутак».*

Памяшканне ў СІЗА цесна звязанае з наданнем статусу злоснага парушальніка, што ў далейшым з'яўляецца глебай для ўжывання артыкула 411 Крымінальнага кодэксу. І гэта актыўна практыкуецца рэжымам.

---

* Ч. 1 арт. 114 КВК

** П.т 305 Правілаў унутранага распарадку папраўчых установаў, зацв. Пастановай Міністэрства ўнутраных справаў Рэспублікі Беларусь ад 20.10.2000 N 174 (ПУР).

## Спецыфічныя незаконныя пакаранні — ноў-хаў ПК-4

*«Такое сярэднявечча! Гэта проста дзіч. Немагчыма ў клетку чалавека замкнуць».*



*Ілюстрацыйнае фота. Крыніца: teso-decor.ru*

Акрамя прадугледжаных Крымінальна-выканаўчым кодэксам пакаранняў, у калоніі ўжываецца шэраг іншых, не прадугледжаных законам. Адно з самых жахлівых — клетка, якая знаходзіцца на тэрыторыі калоніі на кантрольна-прапускным пункце паміж жылой і прамысловай зонамі. Жанчын змяшчаюць у гэтую клетку за адмову ад выканання патрабаванняў супрацоўнікаў або гвалтоўныя канфлікты з іншымі зняволенымі. Жанчыны праводзяць там ад паўгадзіны да 8 гадзінаў. Клетка размешчаная такім чынам, каб яе бачыла як мага больш асуджаных па шляху на працу або з яе, што нясе дадатковыя прыніжэнні і пакуты для пакаранай. Самі супрацоўнікі і зняволеныя называюць гэта «клеткай ганьбы».

*«На ўсеагульны агляд спецыяльна гэтая клетка пастаўленая. Калі ўся зона выходзіць на фабрыку і прыходзіць з фабрыкі, вось*

*спецыяльна ў гэты час туды садзяць асуджаных, каб усе, як у заапарку, глядзелі...»*

Таксама ў якасці пакаранняў у калоніі выкарыстоўваюцца забароны на наведванне клуба і спартзалы, забарона іншым зняволеным камунікаваць з «вінаватымі». Ім маглі не аддаваць лісты ці рваць у іх на вачах, зачыняць прыбіральні ўсяму атраду. Таксама як пакаранне выкарыстоўваецца перасоўванне ў іншую секцыю ці нават іншы атрад, перасоўванне ў прэс-атрад. Для стварэння напругі ў калектыве ў дачыненні да парушальніцы практыкуецца калектыўная адказнасць у выглядзе чытання ПУР усім атрадам, калі ўвесь атрад услых перачытвае правілы дзясяткі разоў.

*«Ці могуць проста спецыяльна не аддаць ад блізкіх сваякоў лісты ў тым ліку, аддаць там не праз тыдзень, калі ён прыйшоў, а могуць не аддаць увогуле, а могуць праз месяц».*

*«Заггасіна ў 13-м, гэтая вось Хаміцкая, яна зачыняла проста нам прыбіральні як пакаранне, Пшанічнікава лісты любіла рваць».*

*«Нас прымушалі чытаць правілы ўнутранага распарадку. Амаль усе палілі, не выпускалі іх паліць, і ціск на яе было ўжо з боку дзяўчатак. Было такое, што свае ж дзяўчаткі ўдарылі яе гэтымі правіламі ўнутранага распарадку, білі па твары, пакуль мы ўсе стаялі».*

У якасці пакаранняў жанчын таксама прымушалі выконваць нейкую зняважлівую і/або бессэнсоўную працу. Напрыклад, ёсць спосаб пакарання, які называюць «Тытанік», калі на падлогу выліваецца вядро ці некалькі вёдраў вады і зняволеная павінна ўсю яе сабраць. Часам жанчын прымушалі проста хадзіць са скрынкамі па лесвіцах і вакол будынкаў, а часам усяму атраду рабілі пажарную трывогу.

*«То бок, мы ўсе вынеслі скрынкі, усе сядзім на вуліцы чакаем, пакуль ён прыйдзе, мяне клічуць у атрад. І мне кажа аператыўнік: «Так, ну ты зараз бярэш скрынкі і ходзіш вакол бамбея».*

*«...«Тытанік» — гэта такі метад пакарання асуджаных, калі бяруцца два вядры вады і выліваюцца на калідор. І асуджаная, якую караюць, павінна з дапамогай анучы як мага хутчэй насуха выцерці ўсю падлогу. Гэта робіцца на каленях, як мага хутчэй, і суправаджаецца нейкімі каментарамі, часцей за ўсё, абразлівага характару».*

## Правакацыі

*«І наконт стаўлення адміністрацыі — яно неяк культывуецца, сеецца ў колы асуджаных, што палітычныя — яны не такія, яны нейкія такія вось ганарыстыя».*

*«Калонія — гэта страшнае месца. Там пагроза нават не столькі ад адміністрацыі... гэта я ўжо маральна была да гэтага гатовая, успрымаць іх так. А менавіта кантынгент».*

Часта нагодай для накладання спагнанняў на палітычных зняволеных з'яўляюцца правакацыі, арганізаваныя зняволенымі па ўласнай ініцыятыве або па ўказанні адміністрацыі. «Актыў» атрада і заггас прымаюць непасрэдны ўдзел у псіхалагічным ціску і запалохванні палітычных зняволеных. Акрамя таго, іншыя асуджаныя могуць фізічна ўздзейнічаць на палітычных па ўказанні аператыўных супрацоўнікаў. У выпадку выканання ўказанняў адміністрацыі такія асуджаныя атрымліваюць магчымасць на нейкае заахвочванне ці паблажкі.

*«Опер дае каманду «фас»... А з улікам таго, што ў 9-м атрадзе амаль усе працуюць на опера, можна каманду даць любому ці ўсім. Гэты чалавек падкідвае іголку, потым нечакана прыходзіць вобшук, знаходзіць гэтую іголку ці гэты нож з машынкі і складаецца рапарт за захоўванне забароненага прадмета».*

*«... адну дзяўчынку вельмі-вельмі моцна збілі, а аператыўны супрацоўнік увесь атрад сабраў у асобным пакоі, у пакоі выхаваўчай працы і вывеў некалькі дзяўчатак, 5-6 дзяўчатак вывеў, каб збівалі адну».*

Самым распаўсюджаным спосабам правакацыяў з'яўляецца падкідванне палітычным зняволеным якіх-небудзь забароненых прадметаў (таблеткі, іголкі, лёзы) у асабістыя рэчы, якія захоўваюцца ў капцёрках, у ложак, у кішэні адзення.

*«... ёй у куртку, у швы запіхнулі іголкі. Пасля яе раптам выклікалі на нейкі агляд і там знайшлі гэтыя іголкі. За гэта таксама пакаранне».*

*«Ну, падкладалі рэчы, ці падкладалі, ці кралі. Таму што ў палітычных увесь час па вопісе правяраюцца рэчы. Ну, у астатніх там некалькі разоў на год, а палітычных часта правяраюць, каб усё-ўсё адпавядала».*

Шырока распаўсюджаныя даносы, асабліва ў прэс-атрадах. Прычым сітуацыя, якая з'яўляецца нагодай для даносу, часта падладжваецца ці нават інсцэніруецца. Часам данос з'яўляецца прыдуманым, што не замінае яго выкарыстоўваць для прыцягнення да адказнасці.

> *«...выклікалі нейкую звычайную зняволеную, якая сабе не можа дазволіць цыгарэты і якая шмат у каго «страляла» іх. І вось яны ёй кажуць — ці ты кажаш, што табе давала такая і такая, як мы хочам, ці ты здаеш усіх астатніх, і тады ўсе астатнія будуць ведаць, што ты іх здала».*

Адміністрацыя ўсяляк спрабуе стварыць атмасферу недаверу, у тым ліку сярод палітычных зняволеных. Так, ствараецца бачнасць добрага стаўлення да адной з палітычных, што дае глебу для плётак, што яна супрацоўнічае з адміністрацыяй, што, як правіла, не адпавядае рэчаіснасці.

> *«Я потым смяялася, кажу, мяне вельмі высока паднялі, кажу. Двум чалавекам ва ўсёй калоніі, гэта мне і Машы Калеснікавай, налілі ваду ў чаравікі».*

> *«Яны ўвесь час спрабавалі нас пасварыць неяк, нейкую смуту ўнесці вось менавіта ў камунікацыю экстрэмістаў. Гэта такія нікчэмныя спробы, хтосьці ідзе на спатканне і ёй дазваляюць вынас. Вынас — гэта калі ты са спаткання можаш вынесці нейкі пакет ежы на пэўную колькасць кілаграмаў. І тыпу па іх сцэнары мы павінны былі ўстаць і такія: «Ну, калі ў яе вынас, дык, яна, напэўна, «працуе», яна, напэўна, шасцёрка».*

Спынімся на апісанні дзеянняў некалькіх асуджаных, якія здзяйсняюць правакацыйныя дзеянні ў дачыненні да палітычных зняволеных.

**Марыя Хаміцкая.** Заггас 13-га атрада. Акрамя выкарыстання свайго становішча для атрымання выгодаў для сябе і набліжаных да яе асуджаных, сама непасрэдна магла «караць» увесь атрад за якія-небудзь парушэнні правілаў адбыцця пакарання.

> *«Калі хтосьці правініўся ў атрадзе, то там нават не начальнік атрада, там заггас давала пакаранне ўсяму атраду. Прычым яе самым любімым пакараннем было зачыніць усе прыбіральні, акрамя адной. ...На некалькі дзён зачыняла проста ўсе кабінкі, скотчам заклейвала дзверы».*

Такія бесчалавечныя паводзіны заахвочваліся з боку адміністрацыі калоніі. Больш за тое, начальнік атрада фактычна надзяляў заггаса Хаміцкую сваімі ўладнымі паўнамоцтвамі, забяспечваючы тым самым страх накладання розных спагнанняў на іншых асуджаных.

*«І, вядома, ніхто не адважваўся аслухвацца, таму што начальнік атрада заўсёды падкрэсліваў, што заггас — гэта як прадстаўнік адміністрацыі, і слова заггаса — гэта роўна практычна слову начальніка атрада. І яна мае права ўсё, што заўгодна, рабіць. І вы не маеце права яе не паслухацца».*

**Вераніка Міхвіеня.** Асуджаная з 14-га атрада, якая непасрэдна пагражала ўжываннем фізічнага гвалту да палітычнай зняволенай, псіхалагічна ціснучы.

*«...прыбіць, хутчэй за ўсё, яна б мяне не прыбіла, але нанесці нейкія пашкоджанні яна б магла. Яна вельмі такая агрэсіўная, вельмі нястрыманая, ну, небяспечны чалавек дастаткова».*

**Стэла Мамулян.** Адна з асуджаных, якая непасрэдна ўдзельнічала ў правакацыях аператыўных супрацоўнікаў калоніі. Стварала сітуацыі, у выніку якіх да іншых асуджаных ўжывалі меры спагнання, дзейнічала па ўказанні аператыўных супрацоўнікаў. Адкрыта выказвала сваю непрыязнасць да палітычных зняволеных, не адмаўляла сваю сувязь з супрацоўнікамі і ўдзел у правакацыйных дзеяннях, знаходзячыся ў 9-м атрадзе.

*«Да нас у атрад перавялі вось гэтую Стэлу Мамулян. Яна такая вельмі... ну ўсе ведалі, што яна з мянтамі працуе. Ну, вельмі несумленная такая».*

Стэла Мамулян з'яўляецца таксама прычынай ужывання спагнанняў да Марыі Калеснікавай.

*«І дзяўчынка, якая ўдзельнічала ў спартландыі ... змагла ўгаварыць Машу пазычыць ёй гадзіннік. Але, мне здаецца, тут спрацаваў такі момант, што ты нібыта пазычаеш не проста чалавеку, а тыпу для патрэбаў калоніі. Літаральна праз невялікі прамежак часу ў атрад прыйшлі супрацоўнікі калоніі, то бок гэта, відавочна, была падстава проста. І на Калеснікаву напісалі рапарт. І я так разумею, гэта было яе першае парушэнне, пасля якога яе адправілі ў ШІЗА».*

Пасля ўдзелу ў дадзеных правакацыйных дзеяннях Мамулян атрымала магчымасць камунікаваць з асуджанай з іншага атрада (атрымала «разнарадкі»).

## Псіхалагічны ціск

***«Гэта такое знішчэнне чалавека як асобы, калі яго прымушаюць прызнаць віну».***

Апроч цяжкай працы, адсутнасці вольнага часу, абмежаваных бытавых умоваў і бездапаможнасці перад несправядлівым прысудам, палітычныя зняволеныя ў калоніі ўвесь час знаходзяцца пад псіхалагічным ціскам. Там ствараецца атмасфера падазронасці, заўсёды варта чакаць падвоху з боку іншых зняволеных. Асобныя зняволеныя, асуджаныя, як правіла, па цяжкіх гвалтоўных артыкулах, выкарыстоўваюцца адміністрацыяй для запалохвання і дыскамфорту палітычных зняволеных.

*«І вось яе таксама ўвесь час падкладалі кудысьці да мяне, або ў спарку, то бок каб яна была дзесьці побач са мной і мяне даймала, і здзекавалася з мяне ўсяляк. І з такім чалавекам побач рэальна страшна знаходзіцца проста. Псіхалагічна страшна. Калі чалавек дагэтуль ганарыцца тым, што яна гэта зрабіла [забойства], і я разумею выдатна, што яна можа мяне забіць і ёй шмат не дадуць, і яна можа на гэта пайсці».*

*«Сядзелі цыганы, якія спецыяльна пачыналі крычаць пра тое, што «вы наагул здраднікі радзімы, вы горш, чым забойцы, ды вас наагул на пажыццёвае трэба саджаць і расстрэльваць». Некаторыя дзяўчаткі не вытрымлівалі, яны проста выбягалі. Справа ў тым, што, калі б яны пачалі адказваць і быў нейкі канфлікт, то яны, натуральна, пайшлі б на штрафны ізалятар, і нічога добрага б гэта не значыла».*




*Фота: Момант вызвалення жанчын з ПК-4. Крыніца: скрыншот тэлесюжэту ont.by*

Для атрымання ад палітычных зняволеных прызнання віны адміністрацыя выкарыстоўвае цэлы букет мераў — ціск, пагрозы, перавод у іншыя атрады, у тым ліку ў прэс-атрад. Пагрозы тычацца стварэння невыносных умоваў адбыцця пакарання, пазбаўлення спатканняў, прэсінгу з боку іншых зняволеных, змяшчэння ў ШІЗА, надання статусу злоснага парушальніка, асуджэння на дадатковы тэрмін па артыкуле 411 КК.

> *«Ну вось вам аркуш паперы і асадка. І вось гэты стосік, гэта на вас я сабраў паказанні. Памяняем адно на іншае? ». ... ну давялося, вядома, давялося проста пагадзіцца, напісаць гэтае дурное пад дыктоўку прызнанне віны. ...ну, гэта проста як грамадзянская кара».*

> *«Ты ж ведаеш, што там парэзалі дзяўчынку. Дык цябе таксама гэта чакае, ты не ведаеш, як там б'юць», — ён кажа. «Цябе таксама гэта чакае. Ну, ты ж напішы, ты падумай пра тое, як табе больш хочацца сядзець, тут ці там».*

> *«Адну жанчыну проста не выпускалі са штрафнога ізалятара ў зімовы перыяд. Там такі холад, што яна расказвала, што абкручвалася туалетнай паперай, каб хоць неяк сагрэцца. Гэтыя жанчыны таксама напісалі прызнанне віны, таму што яны будуць ціснуць да канца. Трымаюцца, спачатку амаль ніхто не прызнаваў віну».*

У нейкі перыяд часу палітычных таксама настойліва ўгаворвалі напісаць на памілаванне. Прызнанне віны з'яўляецца абавязковай умовай ужывання памілавання. У сваіх угаворах супрацоўнікі згадвалі нават канкрэтную колькасць асуджаных, да якіх памілаванне будзе ўжытае. Аднак, абяцанні для большасці аказаліся беспадстаўнымі.

> *«Яна адмовілася пісаць памілаванне. Яе пераводзяць у 9-ты атрад. У яе ў целагрэйцы знаходзяць ушытыя лёзы і яна ідзе на пакаранне, на камісію. Яна абышлася папярэджаннем. Але ёй аператыўнік сказаў: «Калі не хочаш працягу, напішы на памілаванне». І яна тады напісала на памілаванне. І тады яе перавялі назад».*

Пры схіленні палітычных зняволеных да супрацоўніцтва ўжываліся жорсткія пагрозы і здзекі. Жанчынам паведамлялі пра затрыманне іх родных і ставілі іх лёс у залежнасць ад згоды жанчыны на супрацоўніцтва. А таксама пагражалі, што да выхаду на волю іх давядуць да такога стану здароўя, што яны проста самі не змогуць сябе абслугоўваць.

*«Кажа: «Падчас вобшуку была затрыманая вашая свякроў»... І ўсё, і мяне тут проста, я збялела, пачырванела, у мяне ўсё ўнутры проста абвалілася і праваліласяю Я проста страціла дар гаварыць, думаць, ну, гэта проста жудасна, калі паведамляюць такія весткі, а ты ў турме і нічога не можаш даведацца і нічым не можаш дапамагчы. І яны такія: «Ну, ... давайце зробім так. Вы напішыце нам адну паперу, а мы вам дапаможам вырашыць праблему са свякроўю».*

*«І зноў з новым напорам: «Ты ідыётка, у штрафны ізалятар. Будзьце здаровыя». ... «Табе яшчэ сядзець да ..., ты выйдзеш у такім стане, цябе не пазнае ніхто, ты выйдзеш адсюль гароднінай, я табе клянуся», «Ты перастанеш цяміць, ты будзеш хадзіць пад сябе».*



*Фота: Старшыня Савету Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля Качанава падчас працоўнага візіту ў ПК-4 у жніўні 2021 года. Крыніца: belta.by.*

## ПАЗАШТАТНЫЯ СІТУАЦЫІ Ў КАЛОНІІ

Жанчыны расказваюць, што калі ў калонію прыязджае праверка, то калонія фактычна пераводзіцца на ваеннае становішча. Усіх асуджаных прымушаюць сядзець або ў атрадзе на асобным участку, або на працоўным месцы, не дазваляючы нават наведаць прыбіральню. Асабліва сітуацыя пагоршылася пасля таго, як адна са зняволеных паспрабавала паведаміць праверцы пра наяўныя парушэнні, за што пасля была накіраваная ў штрафны ізалятар.

> *«А, увогуле, то бок перыядычна такое адбываецца ў калоніі, што прыязджае якая-небудзь праверка. І калі прыязджае праверка, то ў калоніі абвяшчаецца ваеннае становішча. Гэта калі ўсе павінны быць, усе сядзець у атрадах павінны. І ў асноўным нават не проста ў атрадах, а ў адным памяшканні ў атрадзе, ну, у ПУРы, адпаведна».*

Нярэдка ў калоніі здараюцца сур'ёзныя траўмы, захворванні і нават смерці. Адміністрацыя прыкладае ўсе намаганні, каб такую інфармацыю максімальна захоўваць у таямніцы.

> *«Аднойчы была сітуацыя, калі дзяўчынцы швейнай машынкай адрэзала палец. Яна тлумачыла, што дрэнна бачыць. І, тым не менш, яе прымусілі сесці за швейную машынку. Ёй адрэза-*

---

* https://belta.by/society/view/sozdannye-v-ik-4-uslovija-pozvoljajut-zhenschinam-ispravitsja-i-prodolzhit-zhizn-dostojno-kochanova-453993-2021/

*ла палец, але ў медыцыне таксама, у санчасцы, яе не адвезлі нікуды да лекараў. Не было ніякай праверкі. Проста паставілі, што нібыта яна атрымала драпіну, перабінтавалі рэшту пальцаў і ўсё».*

*«...калі гэта [смерць] адбываецца, то гэта намагаюцца вельмі хаваць. То бок, калі гэта адбываецца ў бальніцы, то пра гэта немагчыма практычна даведацца, толькі калі сваякі не падымуць моцны шум. Калі гэта адбываецца ў бальніцы, то іншыя асуджаныя гэта не ведаюць і не бачаць. Калі гэта адбываецца ў атрадзе, то гэта, у любым выпадку там побач знаходзяцца іншыя людзі, якія гэта ўсё ўбачаць і раскажуць. Такім чынам мне вядома дакладна пра чатыры смерці...»*

## Марыя Калеснікава



*Фота: Палітзняволеная Марыя Калеснікава. Крыніца: РІА Навіны / Яўген Самотаў*

Марыя Калеснікава, лідарка мірнага пратэсту 2020 года, была затрыманая 7 верасня 2020 года і пасля асуджаная да 11 гадоў пазбаўлення волі. Адбывае пакаранне ў ПК-4. Пасля двух гадоў знаходжання ў калоніі была экстрана шпіталізаваная. Рэзкае пагаршэнне здароўя Марыі Калеснікавай і зробленая ёй тэрміновая аперацыя (прабадная язва страўніка) былі выкліканыя жорсткімі ўмовамі яе ўтрымання ў турэмным карцары і несвоечасовым наданнем медыцынскай дапамогі.*

* https://www.golosameriki.com/a/kolesnikova-prison-surgery-conditions/6866316.html

2 верасня 2024 года сястра Марыі Калеснікавай Таццяна Хоміч апублікавала пост у Facebook, у якім паведаміла пра актуальнае становішча справаў:

1. Моя сестра, Мария Колесникова, отбывает наказание в Гомельской ИК-4. В ноябре 2022 года Марию госпитализировали с перитонитом из-за проводной язвы и сделали операцию. Уже более 560 дней информацию о Марии я собираю по крупицам — от сидящих и выходящих из колонии женщин. Последнее письмо от нее мы получили 15 февраля 2023 года. К Марии не может попасть адвокат, ей запрещены посылки.

2. По моей информации, сегодня Мария фактически голодает в колонии. Она весит 45 кг при росте 175 см. Ее болезнь предполагает диету, поэтому она не может есть многое из тюремного меню. Ее лимит на закупки в тюремном магазине — 40 или 80 рублей. Я не могу уточнить сумму, но понимаю, что этого хватит максимум на чай, овсянку, пачку прокладок, мыло, минимальную гигиену.

3. Кормить язвенника баландой — это пытать его и медленно убивать. Не давать человеку права на переписку с семьей - ускорять эту смерть...*

> *«... у гэты дзень Машы Калеснікавай было дрэнна, яе вывозілі на аперацыю ў горад. Усе кантралёры, усе былі занятыя вось гэтым яе, ну, транспартаваннем, аховай, перамяшчэннем, і яны ў гэты дзень не адкрылі наагул на кантрольна-прапускным пункце вакно перадачаў. Гэта была першая субота снежня 2022 года».*

Паводле інфармацыі ад жанчын, якія вызваліліся, Марыя першапачаткова знаходзілася ў 18-м атрадзе, які лічыцца прэс-атрадам. З боку адміністрацыі ёй надаецца самая пільная ўвага і ствараюцца невыносныя ўмовы існавання. Мэтай адміністрацыі з'яўляецца зламаць яе волю і сілу, што не ўдаецца зрабіць да гэтага часу.

> *«Марыя Калеснікава ўпершыню трапіла ў ШІЗА за тое, што пазычыла гадзіннік на час дзяжурства іншай дзяўчынцы.*
>
> *Ізноў жа, Маша Калеснікава, яна адна ў атрадзе, то бок з ёй палітычных ніякіх няма, забараняюць з ёй наагул размаўляць».*

---

* https://www.facebook.com/tatsiana.khomich.kalesnikava/posts/pfbid057VougRV5C9yYxf2CibUJpwJjQSXehsaTD4SoYxPzXqSMZYKVno9TzCZHbpNqc4Ql

# СУПРАЦОЎНІКІ КАЛОНІІ

***«Усе жахі, якія адбываюцца ў калоніі, большасць з іх, яны наўмысныя, то бок гэта спецыяльна зроблена па ўказанні ад супрацоўнікаў. Часцей за ўсё ад супрацоўнікаў аперчасткі і начальніка калоніі».***

Супрацоўнікамі ПК-4 з'яўляюцца службовыя асобы Дэпартамента выканання пакаранняў МУС, якія праходзяць службу ў дадзенай папраўчай установе. У супрацоўнікаў калоніі ёсць іерархія, адміністрацыйнае падпарадкаванне аднаго іншаму, адпаведна, прадстаўнікі ніжэйшага звяна не могуць здзяйсняць пэўныя дзеянні без загада ці ведама вышэйстаячых.

Супрацоўнікі ПК-4, якія ў пераважнай большасці праходзяць службу ў калоніі, маюць пэўнае званне, канкрэтныя службовыя паўнамоцтвы. А тыя, якія з'яўляюцца «грамадзянскімі» супрацоўнікамі, не маюць званняў, адпаведнай выслугі гадоў і сацыяльных бонусаў.

У сваёй дзейнасці супрацоўнікі павінны няўхільна выконваць заканадаўства Рэспублікі Беларусь, прафесійную этыку, прытрымлівацца высокіх маральных і этычных стандартаў. Разам з тым, аўтарамі расследавання зафіксаваныя шматлікія выпадкі злачынных дзеянняў, грубых неэтычных учынкаў з боку супрацоўнікаў ПК-4 у дачыненні як да палітычных зняволеных, так і да іншых зняволеных.

*«...але разумееце, там усё неналежнае можа быць дазволена з дазволу адміністрацыі...»*

У ПК-4 створаная такая абстаноўка, калі парушаецца не толькі заканадаўства Беларусі, якое гарантуе асобам, якія адбываюць пакаранне, пэўныя ўмовы і правы, але і базавыя правы чалавека. Супрацоўнікі калоніі праводзяць сістэматычную рэпрэсіўную палітыку ў дачыненні да палітычных зняволеных.

## Начальнік калоніі і яго намеснікі

***«Індывідуальны фактар начальніка. Аднаму начальніку хочацца так, іншаму інакш. Хтосьці лянотны, хтосьці скурпулёзны».***

Начальнік калоніі валодае максімальна шырокімі паўнамоцтвамі як найвышэйшая службовая асоба ў папраўчай установе.

Да 16 жніўня 2024 года ПК-4 кіраваў Дзяніс Талсцянкоў. З пазначанай даты начальнікам стаў падпалкоўнік унутранай службы Станіслаў Кавалёў, які раней займаў пасаду намесніка начальніка па рэжыме і аператыўнай працы. Паводле звестак СМІ, з ліпеня 2024 года змянілася ўсё кіраўніцтва ПК-4: часовай выканаўцай абавязкаў намесніка начальніка па папраўчым працэсе была прызначаная маёр унутранай службы Алена Леанідаўна Драздова, часовым выканаўцам абавязкаў намесніка начальніка па рэжыме і аператыўнай працы быў прызначаны маёр унутранай службы Мікіта Пятровіч Алёхін.*

* https://t.me/MAYDAYMog/4424

## №001



**ФИО**

## Талсцянкоў Дзяніс Анатолевіч

**должность, звание**

1. а 16 жніўня 2024 года з'яўляўся начальнікам ПК-4, 1977-08-17 г.н.

9 жніўня 2024 года Вялікабрытанія пашырыла спіс санкцыяў у дачыненні да Беларусі. Пад новыя абмежаванні патрапіў, у тым ліку, былы начальнік ПК-4 Дзяніс Талсцянкоў**.

Талсцянкоў на першапачатковым этапе размяркоўваў новых асуджаных па атрадах. Крытэрам размеркавання палітычных зняволеных ён абірае найгоршую абстаноўку ў атрадзе, магчымасць прэсінгу зняволенай як з боку аператыўных і рэжымных супрацоўнікаў, так і з боку іншых зняволеных.

> *«Я так зразумела, што маё знаходжанне менавіта вось у гэтым атрадзе было пакараннем, таму што я яму адказвала крыху дзёрзка на размеркаванні пасля каранціну».*

Талсцянкоў як начальнік калоніі таксама адказны за шматлікія факты накладання на палітычных зняволеных неабгрунтаваных, незаконных спагнанняў. Ён па пасадзе ўзначальваў камісію, якая вызначае, якое менавіта спагнанне будзе накладзенае, за яго подпісам выносіліся пастановы. Пры гэтым ён маральна здзекаваўся са зняволеных, абражаў іх, пагражаў накладаннем новых спагнанняў і прыцягненнем да крымінальнай адказнасці па артыкуле 411 КК.

> *«Ён усіх нас шчыра ненавідзеў, гэта было відавочна. Натуральна, што з яго папушчальніцтва пастаянна закручваліся гайкі ў калоніі. То бок, як і для нас, так і для звычайных зняволеных. Ну, і наогул, калі ён на камісіях размаўляў са зняволенымі, ён заўсёды стараўся неяк прынізіць, абразіць.*
>
> *Ён на мяне крычаў і абражаў...*
>
> *У дачыненні да [імя] у такім духу мог казаць: «Ты — малпа, ідзі ў сваю Эфіопію...» Вось так».*

Дзяніс Талсцянкоў, як і іншыя супрацоўнікі ПК-4, ставіў за пастаноўкай на прафілактычны ўлік палітычных зняволеных. Фактычна гэтае мерапрыемства з'яўлялася стыгматызацыяй асобнай групы асуджаных.

Талсцянкоў не хаваў сваёй непрыязнасці да беларускай мовы, рабіў заўвагі асуджаным, якія выкарыстоўваюць яе ў камунікацыі.

> *«Ну, я сказал: «Вітаю вас». А ён сказаў: «Ну што, вы гэта будзеце з сяброўкамі там размаўляць». Я кажу: "З сяброўкамі я кажу «прывітанне», гэта розныя паняцці». Вось і ўсё. А ён сказаў: «Ну добра, можна ж было сказаць «добры дзень», ці «добрай раніцы». Ну, вось нейкія прыдзіркі такія незразумелыя».*

* https://luka.zone/person/f0c0d3a9-b522-4bfd-af39-dc4e1d8f9ca0
** https://t.me/MAYDAYMog/4412

**№002**



**ФИО**

**Кавалёў Станіслаў Сяргеевіч***

**должность, звание**

наместнік начальніка ПК-4 па аператыўна-рэжымнай частцы. З 16 жніўня 2024 года з'яўляецца начальнікам калоніі. 1984-12-12 г.н.

Знаходзячыся на пасадзе наместніка начальніка калоніі па рэжыме і аператыўнай працы (меркавана, да 16 жніўня 2024 года), кіраваў фактычна ўсімі аператыўнымі і рэжымнымі супрацоўнікамі калоніі. Менавіта з яго падачы і пад яго кіраўніцтвам здзяйсняліся меркаваныя злачынствы, катаванні і жорсткае абыходжанне ў дачыненні да палітычных зняволеных.

*«І вось яны былі ўдваіх, я так разумею, сябры з гэтым Зюзіным. І калі яны прыходзілі ў атрад, яны ладзілі… усе адразу хаваліся і ўцякалі куды-небудзь… бо адразу ты атрымаеш рапарт, яны да чаго-небудзь абавязкова прычэпяцца. То бок, яны рабілі вобшукі, пераварочвалі ўсё на свеце. Ну такія гаспадары жыцця. Прыходзілі павесяліцца.*

*…па яго распараджэнні ва ўсіх атрадах прыбралі абразы».*

* https://luka.zone/person/4294da8c-89e6-4855-912b-2c589759864f

## №003



**ФИО**

**Лукомская Алена Пятроўна***

**должность, звание**

былая намесніца начальніка ПК-4 па папраўчым працэсе, 1976-07-27 г.н.

У ПК-4 больш не працуе. У ліпені 2024 года ёй споўнілася 48 гадоў, што азначае для сілавікоў дасягненне пенсійнага ўзросту**.

Алена Лукомская на пасадзе намесніка начальніка па выхаваўчым працэсе ПК-4, пачынаючы з этапа каранціну, праводзіла гутаркі з палітычнымі зняволенымі наконт прызнання віны ў здзейсненых «злачынствах» і напісання прашэння аб памілаванні. Пры гэтым камунікацыю яна вяла груба, дапускала маніпуляцыі, пагрозы. Выконваючы загады кіраўніцтва калоніі, яна таксама ўдзельнічала ў рэпрэсіях у дачыненні да палітычных зняволеных.

> *«То бок, проста казала: «Не хочаце?» Ты кажаш: «Не, не хачу». Яна кажа: «Ну вось, а падумайце пра бацькоў, яны ж там пакутуюць…»*

> *«Праводзіла гутаркі і намесніца начальніка калоніі па папраўпрацэсе, Лукомская, …была дастаткова грубай, казала пра тое, што тут мне крылы падрэжуць».*

* https://luka.zone/person/7a7c4de9-eece-4f02-bee2-79865121fa45
** https://mspring.media/ru/new-boss-in-prison/

## №004



**ФИО**

**Драздова Алена Леанідаўна***

**должность, звание**

намесніца начальніка калоніі па папраўчым працэсе, 1978-04-03 г.н.

Займаючы пасаду намесніцы начальніка калоніі, таксама брала ўдзел у ціску і запалохванні палітычных зняволеных.

*«… і яшчэ забаўны факт пра яе, што гэтая начальніца папраўчага працэсу, які як быццам павінен цябе выпраўляць, але яна ўвесь час выкарыстоўвае мат, і мацюкаецца пры людзях, пры асуджаных».*

*«…Ён пачынае казаць, што мне трэба напісаць прызнанне віны, з пагрозамі ШІЗА… мы зайшлі ў суседні кабінет, дзе сядзела жанчына, гэта была Драздова Алена Станіславаўна. Гэтая жанчына пачынае таксама са мной размаўляць… потым яна пачала задаваць пытанні наконт крымінальнай справы. Казала: «Можа, ты ўсё ж вінаватая ў тым, што сядзіш, можа, варта напісаць гэтае прызнанне віны». У мяне былі чаканні, што яна жанчына, зараз мяне зразумее, што мне пагражаюць, скажа, што гэта беззаконне, і мне дапаможа. …неяк яны мяне ўдвох, у працэсе яна таксама падключылася да таго, што "ты ж разумееш, што складана выконваць усе правілы ўнутранага распарадку, ніхто не ідэальны», падводзіла да таго, што сапраўды можа быць ШІЗА за любую дробязь».*

* https://luka.zone/person/b0295fb8-4d82-4b3d-bd4f-cb364e48661a

**№005**



**ФИО**

**Алёхін Мікіта Пятровіч***

**должность, звание**

начальнік аператыўнага аддзела ПК-4, 1988-08-24 г.н.

Непасрэдна браў удзел у праванакцыях у дачыненні да палітычных зняволеных, запалохваў іх, пагражаў неабгрунтаваным накладаннем спагнанняў, выкарыстоўваў надуманыя нагоды, каб прымусіць пісаць «прызнанне віны» і хадайніцтва аб памілаванні.

*«… Аказваецца, гэта начальнік аператыўнага аддзела калоніі, пагроза ўстановы.*

*… І вось ён падыходзіць да мяне: «Ну, што? ». Я стаю, не разумею, што ён ад мяне хоча. «Ты віну прызнаеш? ». Я кажу: «Я не здзяйсняла нічога супрацьзаконнага». І ён наглядчыку кажа: «Вось за гэтай асаблівы кантроль».*

Вось з усіх людзей у калоніі, калі трэба ціснуць на нашых дзяўчатак, гэтым непасрэдна заўсёды практычна займаецца Алёхін. Часам і аператыўнікі прасцейшыя, ніжэйшыя статусам, але ўсё роўна гэта па яго ўказцы».

Алёхін асабіста забараняў зняволеным камунікаваць з «палітычнымі», пагражаючы спагнаннямі за спробы камунікацыі або пазбаўленнем нейкіх правоў, караў асуджаных, якія дапамагаюць палітычным зняволеным.

*«…яна даўно ўжо сядзіць і нарадзіла дзіця…калі дзіцяці спаўняецца год, маці можа пераехаць у «Дом маці і дзіцяці». Яна вельмі гэтага хацела, і да яе прыйшоў Алёхін і сказаў, што калі ты будзеш камунікаваць з [імя], то ты можаш развітацца з ДМД, ты там не будзеш жыць».*

*«І гэтая дзяўчынка мне потым перадала інфармацыю, што нібыта ён абвінавачваў яе, што яна выдала інфармацыю мне пра тое, што ў мяне плануецца [праванакцыя]… пакуль у яе самой не пачаліся праблемы. Яе знялі з усіх пасадаў і гэтак далей».*

Акрамя таго, Алёхін запалохваў палітычных зняволеных непасрэдна перад вызваленнем, пагражаючы паўторным затрыманнем як ім самім, так і іх сваякам, якія прыедуць іх сустракаць.

*«І калі мы вызваляліся, нас здымалі на відэа… гэты працэс, як ты ўсё гэта робіш. Алёхін стаяў такі з тэлефонам і здымаў».*

*«… паспрабаваў пагражаць, што «Калі вы там якую-небудзь масавую акцыю, крый божа, зладзіце каля дзвярэй калоніі, вас тут жа прыедзе, забярэ АМАП».*

* https://luka.zone/person/b8c5f817-53b0-454b-bf12-8501cb946489

## Аператыўныя супрацоўнікі

***«І такое часта бывае, ёсць пара аператыўнікаў, у якіх пакаранне амаль заўсёды, гэта забраць усе свае скрынкі з капцёркі на сябе і хадзіць усім атрадам з гэтым па ўсёй калоніі. Ну тыпу ў цябе можа быць рэальна пасылка прыйшла толькі, у цябе можа быць там сваіх рэчаў 20 кілаграмаў, і яшчэ 50, і ты такі на сябе, у рукі, зіма, дапусцім, і ты ідзеш, ці лета, +30, ты ідзеш з часткай атрада, або з усім атрадам, які цябе ненавідзіць, і які потым прыдумляе, як табе адпомсціць, і паралельна яшчэ крычыць, што ты за чалавек».***

Менавіта аператыўныя супрацоўнікі ў ПК-4 з'яўляюцца той групай супрацоўнікаў, якія непасрэдна выкарыстоўваюць рэпрэсіўныя практыкі супраць палітычных зняволеных. Яны дзейнічаюць як самастойна (абражаюць, пагражаюць, запалохваюць, фабрыкуюць рапарты пра парушэнні з боку зняволеных і падобнае), так і праз іншых супрацоўнікаў і зняволеных.

*«І ў розных атрадаў розныя аператыўныя супрацоўнікі, жыццё асуджаных залежыць у найбольшай ступені ад аператыўных супрацоўнікаў, таму што ёсць больш жорсткія, ёсць крыху менш жорсткія… Нейкія любяць караць больш, нейкія менш».*

Аператыўныя супрацоўнікі часта ўздзейнічаюць на палітычных зняволеных праз іншых асуджаных. Часцей за ўсё выкарыстоўваюцца метады «калектыўнай адказнасці», калі за нейкія надуманыя парушэнні з боку палітычнай зняволенай увесь атрад, уся секцыя трапляе пад пакаранне (пераноска рэчаў, працы па прыбіранні тэрыторыі), што выклікае ціск на палітычную асуджаную з боку ўсяго атрада, секцыі.

*«Ёсць аператыўнікі, як наш, які вырашае пытанні іншага тыпу. Ён проста псіхалагічна ўздзейнічае на розных людзей, і настройвае адно супраць аднога, а яны там самі пачынаюць дадумваць, дзівачыць, а ён проста потым глядзіць, як гэта далей, як шэры кардынал, здалёку…»*

Аператыўныя супрацоўнікі звяртаюцца да такіх метадаў псіхалагічнага ўздзеяння на індывідуальным узроўні як правакацыі, пагрозы спагнаннямі, для «страўлівання» паміж сабой палітычных зняволеных.

*«І так некаторыя палітзняволеныя пачыналі абвінавачваць*

*іншых палітзняволеных... адна палітзняволеная абвінавацiла іншую палітзняволеную, што нібыта яна здала яе рэжымным супрацоўнікам, што ў яе ляжыць у капцёрцы не яе дажджавік. Рэжымныя супрацоўнікі прыйшлі і палезлі менавіта ў тое месца, дзе ён ляжыць, то бок яны ведалі, дзе што. І гэта праца аператыўніка, ён настройваў на гутарках, калі выклікаў, ён мог не даваць ніякіх парушэнняў у той момант, але гэта псіхалагічная гульня».*

Даносы ў калоніі шмат у чым тлумачацца тым, што менавіта ад супрацоўнікаў залежыць рэалізацыя ўсіх правоў асуджаных. Напрыклад, на асуджаную можа быць накладзенае спагнанне ў выглядзе пазбаўлення чарговага спаткання, перадачы. Адпаведна, кожная асуджаная абірае, ці супрацоўнічаць ёй з аператыўным супрацоўнікам або пазбавіцца прадуктаў харчавання, сродкаў асабістай гігіены, адзення, камунікацыі з блізкімі.

*«... Аператыўнікі любілі скруціць матрац слімаком такім, узяць прасцінаў і накруціць там нейкіх вузлоў на гэтым матрацы, і падвесіць на ложак...і ты прыходзіш, табе застаецца там 10 хвілінаў да праверкі, а ты спрабуеш гэта ўсё развязаць, неяк прывесці ў парадак, таму што калі ложак у непрыстойным выглядзе, за гэта можна атрымаць пакаранне».*

*«Там з яе фактычна здзекаваліся іншыя зняволеныя. То бок, там, ну, проста і маральна ціснулі, і неяк фізічна яе шпынялі. ... Ну, такім чынам паводзіць сябе з ёй, вось такое стаўленне да яе было абумоўленае тым, што начальства і аператыўнікі, і так далей рабілі такую замову, то бок адмыслова».*

Асноўныя рэпрэсіўныя практыкі ў дачыненні да палітычных зняволеных накіраваныя на маральны злом чалавека, атрыманне пісьмовага прызнання ім «віны», прашэння аб памілаванні. Метады дасягнення такой мэты адрозніваюцца ў залежнасці ад канкрэтнага аператыўніка, запытаў кіраўніцтва калоніі і знешніх фактараў.

*«... тых, хто сядзяць палітычныя, курыруе менавіта ГУБАЗіК. І яны вызначаюць, як абыходзіцца з чалавекам, яны даюць указанні аператыўным супрацоўнікам калоніі па тых жа самых пытаннях, прамацаць чалавека, зразумець яго настрой, што ён з сябе ўяўляе. Вось. Ходзіць інфармацыя, што прэсінг ажыццяўляецца праз ГУБАЗіК».*

№001



**ФИО**

**Чорны Ігар Віктаравіч***

**должность, звание**

аператыўны супрацоўнік ПК-4,1989-04-09 г.н.

*«У мяне таксама былі пагрозы ад Чорнага. Апошнія разы, калі мы з ім камунікавалі наконт маіх парушэнняў, ён мяне пагражаў перакінуць у дзявяты, з іроніяй, ну тыпу: «Ну што ты, ну класны атрад жа, чаго ты пачынаеш?».*

*... яго задача была такая, каб ён спрабаваў раскруціць людзей на яўкі, новыя, новых злачынстваў і ўсё такое. І вось дзяўчаткі, якія вярталіся, расказвалі, што была жахлівая размова і ён там з імі жорстка размаўляў:*

*. у цябе 205 артыкул, вось раскажы пра сваіх сяброў, ды яны ж 100% там таксама, не ведаю, крадуць, наркаманяць, усё такое. Вось глядзі, а то мы можам там табе павесіць, там паедзеш».*

*«Людзі пісалі даносы ў такой колькасці, што абсалютна было немагчыма ў гэта паверыць. Таму што аднойчы я праходзіла міма чалавека, які пісаў тыпу пахвілінна, што я рабіла, і мне падалося, я падумала, таму што я ўбачыла прозвішча [прозвішча], і там: «09:35 [прозвішча] падсела да нейкага чалавека і пачала размаўляць». І ўсё ў такім стылі».*

* https://luka.zone/person/ba36988c-d029-429e-a283-ba2d7997b94a

## №002



**ФИО**

## Кузняцоў Аляксандр Мікалаевіч*

**должность, звание**

аператыўны супрацоўнік ПК-4, 1991-03-21 г.н.

*«Усе самыя такія жудасныя гісторыі, якія, я думаю, усе расказваюць, і я ў тым ліку, звязаныя звычайна з Кузняцовым. Адзін з асноўных атрадаў, дзе адбываліся гэтыя жудасныя рэчы, гэта дзявяты. Яго сярод асуджаных часта называюць, насабліва сярод палітзняволеных, «прэс-хатай», ну «прэс-хата» не ў разуменні таго, што пакой там ёсць нейкі, а ў тым сэнсе, цалкам атрад».*

*«Кузняцоў, гэта самы быў жудасны аператыўны супрацоўнік там. Ён арганізоўваў …9 атрад, прэс-атрад, гэта была яго рук праца. Потым, у 18-м ён быў аператыўнікам, дзе Маша была Калеснікава. Ён самы заўзяты такі…»*

*«Пронін рэжымнік, аператыўнік — Кузняцоў. Ні з таго, ні з гэтага зачыніліся са мной у капцёрцы… і проста пачалі рабіць нейкую дзіч. «Ты што, ты хто такая? Што, табе падабаецца сядзець, так? Ты ў штрафны ізалятар патрапіш, у цябе там усе валасы павыпадаюць». Я кажу: «Добра, прабачце, а ў чым справа? ». «А справа ў тым, што ты здраднік радзімы»».*

*«…але раззлаваўся на атрад, з большага на палітзняволеных…Сказаў усім узяць брускі мыла гаспадарчага, і ўзбіць іх да пены… І потым прыбіраць падлогу, намыльваць падлогу васьмёркамі проста. Калі ты робіш гэта не так, то пачынаецца ціск, крыкі… Увесь свой вольны час ты сядзіш і шчоткай надрайваеш васьмёркамі падлогу да таго моманту, пакуль ён не скажа, што можна спыніцца…»*

*«Паняцце пра калектыўныя пакаранні і віды гэтых калектыўных пакаранняў прыйшлі ў калонію з прыходам Кузняцова. Ён прыдумаў гэтую забаўку са скрынкамі. Словазлучэння «пойдзем гуляць са скрынкамі» баяцца ўсе ў калоніі, таму што нагода можа быць абсалютна любой для гэтага… Пачаў пытацца ў палітычных, як яго завуць, спытаў у мяне, а я не ведала, як яго завуць. Ён сказаў, што ўвесь атрад ідзе даставаць скрынкі з капцёркі і спускае іх на першы паверх, а мы жылі на чацвёртым».*

*«Яшчэ адзін від пакарання — хадзіць вакол Бамбея, гэта лакальны ўчастак, ён так называецца, таму што там знаходзіцца больш за ўсё атрадаў, там тры атрады. Мы ідзем з працы, падыходзім да атрада, нам кажуць, што мы не ідзем у атрад, а павінны хадзіць вакол Бамбея гадзіну да праверкі. Гадзіну вы проста ходзіце строем. Гэта калектыўнае пакаранне, звычайна кажуць, хто вінаваты, за яго ўсе і ходзяць, напрыклад, хтосьці дрэнна засцяліў ложак, праз гэта ўсе ходзяць».*

*«…якія па загадзе адміністрацыі калоніі людзей маральна проста забіваюць. І такое адбываецца вельмі часта з любымі, хто ідзе супраць адміністрацыі. У мяне ў гэтым атрадзе былі парэзаныя наўлечка, прасціна. У мяне былі ўвесь час вусені ў кубку з гарбатай, у мяне былі, ну, то бок пасцянна вывернутае вядро вады на ложку. І гэта ўсё рабілася з дазволу супрацоўніка Кузняцова, таму што ён з'яўляўся аператыўным куратарам гэтага атрада».*

*«Потым ён прыдумаў яшчэ такое пакаранне, выносілі шконку, з жылой секцыі на вуліцу, ды і ўвесь атрад павінен быў бы па чарзе разаслаць ложак і заслаць. Гэта было ўлетку, я памятаю, была невыносная спякота, хто без прытомнасці там падаў… Ну, уявіце, у атрадзе 97 чалавек, і каб разасланць цалкам ложак і заслаць яго».*

*«Ён вельмі любіў калектыўныя пакаранні, калі ўвесь атрад выбудоўваецца на вуліцы. І вось ён так вось прымушаў нас стаяць па гадзіне, па дзве таксама зімой. …гэта быў канец лістапада, снежань».*

* https://luka.zone/person/2e56d163-8bd4-44f2-aa88-d3fe127e8864

**№003**



**ФИО**

**Зюзін Аляксей Алегавіч***

**должность, звание**

аператыўны супрацоўнік ПК-4, 1998-02-19 г.н.

*«Ведаеце, суіцыдальныя думкі, яны дастаткова часта ўзнікалі. Бо там было невыносна знаходзіцца. … у 14 атрадзе такія людзі былі. Прычым гэтыя людзі, яны нават не хавалі тое, што ім гэта загадаў зрабіць аператыўны супрацоўнік Зюзін. Ён даваў загад, каб яны мяне абражалі ўсяляк».*

*«Ён неяк дэманстратыўна знішчаў пры мне мае лісты… а калі я папрасіла яго не знішчаць канверт, ён сказаў «Не, так трэба», і ўзяў парваў. Як яго можна ахарактарызаваць? Ну, гэта подласць чалавечая. І проста дзіўна, як такі малады хлопец…вось як ён мог сябе так паводзіць, адкуль у чалавека ў такім узросце столькі ўсярэдзіне бруду душэўнага?»*

*«Яе пры затрыманні моцна збіў ГУБАЗіК. І ў яе траўма псіхалагічная сур'ёзная наконт ГУБАЗіКа. І наш опер разам з іншым… Наш быў Зюзін, а там Кавалёў…надзявалі балаклавы, прыходзілі да яе, пачыналі што-небудзь у яе пытацца, што заўгодна, на праверцы прафуліка. — «Вам не падабаюцца балаклавы, так? А што так? ГУБАЗіК вам не падабаецца яшчэ». Ну, значыць, адкрыты такі здзек. А ў яе пачынаецца істэрыка ад аднаго выгляду балаклавы».*

*«Зюзін, мой новы аператыўны куратар, ён вельмі любіў зайсці ў атрад. «С»., я кажу «Так», «Бачыў фотаздымкі вашай юнай маладосці. Ну, канечне зараз вы, гэта піздзец». Я кажу: «Ну, ведаеце, у вашай устанoве не дзіўна». Ці пры ўсім атрадзе, «С., раскажы, як можна быць такім здраднікам? Людзі, вы ведаеце, што яна здрадзіла радзіме?». І вось гэтае пастаяннае прыніжэнне, пастаянныя нейкія абразы. Ухіл на тое, што я жудасна выглядаю».*

* https://luka.zone/person/a764352b-e456-47e1-b8eb-a24d379eccf5

**№004**



**ФИО**

**Ганчароў Яраслаў Аляксеевіч***

**должность, звание**

аператыўны супрацоўнік ПК-4, 1998-09-04 г.н.

*«Ён вельмі непрыемны чалавек. І такі аматар паздзекавацца проста... хтосьці правініўся,... з кантрольна-прапускнога пункта ідзе дзяжурны ў атрад званок, атраду загадана стаць на вуліцы, зіма...мы замест таго, каб у нас вольны час, папіць гарбаты, нешта сагрэцца, усе становімся на вуліцы зімой і стаім. Стаім 5 хвілінаў, 10 хвілінаў, 15, паўгадзіны стаім».*

*«...непасрэдна Зюзін і Ганчароў, неяк запрашалі яе на размову. Яны схілялі яе да супрацоўніцтва. І падманным спосабам спрабавалі ёй давесці, што яе свякроў ужо арыштаваная, што яна знаходзіцца пад следствам праз яе, і толькі яна магла ёй дапамагчы. І яна мусіць пайсці проста з імі на супрацоўніцтва. Спрабавалі прымусіць падпісаць яе паперу. Давялі проста да істэрыкі, да слёз».*

*«Яны пачалі да мяне часцей прыходзіць, вось гэты вось Ганчароў Яраслаў з нейкімі яшчэ супрацоўнікамі, пачалі весці са мной непрыемныя размовы. Ну, натуральна, заўсёды называючы мяне адкідам, здраднікам. Намякаючы на тое, што лепшае, што я магу зрабіць, гэта напісаць прашэнне аб памілаванні».*

*«Фактычна кожны тыдзень Зюзін і Ганчароў выклікалі мяне на размову. Гэтыя размовы мелі характар: «Ты ідыётка. Ты што, такая вось добранькая, думаеш, так?», «Са штрафнога ізалятара не выйдзеш, ды мы цябе.., ды паедзеш на Рэчыцу пасля гэтага, пасля гэтай калоніі». То бок псіхалагічна гэта было вельмі цяжка вытрымаць».*

* https://luka.zone/person/2541d12f-f14d-46fb-9fca-e026836eb7ee

## №005



**ФИО**

**Баранаў Даніла Валянцінавіч***

**должность, звание**

аператыўны супрацоўнік ПК-4, 1998-09-10 г.н.

*«Баранаў, ён хоць і мог скласці ліпавыя рапарты на мяне, па-мойму, ён не склаў ніводны рапарт, але адкрытым прэсінгам такім ён не займаўся. Проста яму сказалі, што на гэтую, на гэтую і на гэтую трэба запісаць парушэнне. Ну, окей добра, выканаю. А так, каб прам як Зюзін з Ганчаровым, ну не».*

* https://luka.zone/person/1e402dd5-7c7c-42d5-a72b-179a1176f727

## №006



**ФИО**

**Кляўко Ягор Андрэевіч**

**должность, звание**

аператыўны супрацоўнік ПК-4

*«Там мяне сустрэў мой аператыўнік Кляўко. Прывёў у кабінет. Там жа быў Зюзін. Пачалі ўсё ж такі, як звычайна, са сваім гумарком: «Нешта ты моцна спакойна сядзіш. Трэба табе рапарт, а то ва ўсіх амаль ёсць, а ў цябе не. Выбірай за што»… праз пару дзён да мяне прыйшоў Кляўко зноў і сказаў, што ў той дзень, калі ў нас быў вобшук, я нецэнзурна гучна лаялася ў капцёрцы на адрас супрацоўнікаў адміністрацыі».*

*«Я дзяжурыла па санвузле, мыла ўнітазы, там усе ў пальчатачках. І ён зайшоў, нібыта чакаючы са мной размовы. І пакуль я прыбірала, ён трымаў тэлефон у руцэ. Ён увесь час з тэлефонам у руцэ. І, як потым аказалася, відаць, ён запісваў відэа. Таму што самы нейкі агідны, проста ўсраты скрын з гэтага відэа, нейкім чынам, дзе я проста выглядаю, як быццам мяне паднялі, ён трапіў у рукі ГУБАЗіК, і яны посцілі яго ў сваіх рэсурсах».*

## Начальнікі атрадаў

Начальнікам атрада ў ПК-4 з'яўляецца службовая асоба, якая мае званне і выконвае ўнутрыатрадныя арганізацыйныя функцыі, сочыць за выкананнем дысцыпліны, зацвярджае графікі дзяжурстваў, дапамагае вырашаць пытанні, звязаныя з бытавым жыццём зняволеных, удзельнічае ў выхаваўчай працы ўнутры атрада і іншае.

> *«І мне першы час яна здавалася вар'яцкай, таму што яна амаль кожны дзень збірала атрад у ПУРы… і яна проста на ўсіх крычала вельмі гучна і нават магла выкарыстоўваць якія-небудзь такія вельмі з'едлівыя словы, то бок не прама мат, але абразлівыя якія-небудзь заявы».*

> *«І ў гэтым атрадзе была адразу вельмі цяжкая атмасфера. Недзе памыліліся зняволеныя і гэтая Вікторыя Аляксандраўна была вельмі незадаволеная. Яна хадзіла і крычала на ўсіх. Яна крычала так, што я думала, што мне спатрэбіцца памперс… Яна проста пачала пагрозліва крычаць: «Калі, крый божа, вы дасце каму-небудзь цыгарэту, каўбасу, з кім-небудзь пап'яце гарбату, ці данесяце да каго-небудзь, ці што-небудзь возьмеце з сабой…Я вам пакажу, хто я ёсць, вы ў мяне з ШІЗА не выйдзеце». Было вельмі шмат такіх пагрозаў».*

Спынімся толькі на апісанні фактаў узаемадзеяння начальнікаў атрадаў з аператыўнымі супрацоўнікамі, калі яны фактычна ўдзельнічаюць у рэпрэсіях у дачыненні да палітычных зняволеных. Гэта можа праяўляцца ў асаблівай увазе да палітычных зняволеных, калі начальнік атрада выконвае свае службовыя абавязкі, але праяўляе відавочна прадузятае, дыскрымінацыйнае стаўленне да групы «жоўтабірачных».

> *«… таксама пагрозамі мяне спрабавала прымусіць пайсці ў нядзелю на працу. Яна перыядычна ладзіла чамусьці менавіта мне, не ведаю, дагляды са скрынкамі, калі ты павінен вынесці ўсе свае скрынкі і яна павінна іх даглядзець».*

> *«…яна сабрала, сабрала нас неяк усім атрадам і даслоўна крычала, што вы жывёлы, якім месца за плотам. Гэта яе даслоўныя словы. То бок, мы жывёлы, якія не могуць выйсці на волю».*

Саўдзел у рэпрэсіях з боку начальнікаў атрадаў выяўляўся і ў непасрэдным удзеле ў «аператыўных» мерапрыемствах сумесна з іншымі супра-

цоўнікамі калоніі. Начальнікі атрадаў маглі як проста пагражаць прыцягненнем да адказнасці без рэальных парушэнняў, так і непасрэдна ўдзельнічаць у правакацыях: падкідваць у маёмасць зняволеных недазволеныя прадметы, маральна здзекавацца і абражаць, схіляць да пісьмовага «прызнання віны», напісання хадайніцтва аб памілаванні.

**№001**



**ФИО**

**Максімчыкава Ангеліна Сяргееўна***

**должность, звание**

начальніца атрада № 9 у ПК-4, 1993-10-06 г.н.

*«Максімчыкава любіла даваць індывідуальныя заданні менавіта палітычным зняволеным … людзі проста прыходзілі да іх, і кідалі ў твар сваю брудную бялізну, недзе ў месячных, недзе там у лайне, у мачы, проста смярдзючая, потная».*

*«Усе жахі, якія адбываюцца ў калоніі, большасць з іх, яны наўмысныя, то бок гэта спецыяльна зроблена па ўказанні ад супрацоўнікаў. Часцей за ўсё, ад супрацоўнікаў оперчасткі і начальніка калоніі. Але таксама там прысутнічалі супрацоўнікі, такія як Максімчык Ангеліна Сяргееўна, якая з'яўлялася начальніцай 9-га атрада, гэтага «прэс-атрада», якая ўдзельнічала таксама ў розным збіцці і ў розных гнабленнях, у вымагальніцтвах і іншае».*

* https://luka.zone/person/2a332ec5-1f72-4651-9317-dedcbf9fe600

## Іншыя супрацоўнікі

У калоніі шмат розных супрацоўнікаў, якія, выконваючы самыя розныя функцыі, удзельнічалі ў рэпрэсіях, выкарыстоўваючы свае службовыя паўнамоцтвы для пераследу палітычных зняволеных.

№001



ФИО

Сіўцоў Андрэй Валянцінавіч*

должность, звание

начальнік рэжымнага аддзела ПК-4, 1988-02-12 г.н.

*«... з яго прыходам у калонію, калі ён стаў начальнікам рэжымнага аддзелу, то вельмі шмат усялякіх пагаршэнняў па ўмовах з'явілася. Напрыклад, гэта менавіта з яго з'яўленнем забаранілі каляровыя шкарпэткі, то бок каляровае адзенне, толькі ўсё чорнае. Ну, толькі трусы і споднія майкі, і станікі маглі заставацца нейкіх іншых колераў. Ён забараніў басаножкі...»*

* https://luka.zone/person/22d916b1-c517-4b04-bf74-ea429a959005

**№002**



**ФИО**

**Дашэўская Ала Уладзіміраўна***

**должность, звание**

супрацоўніца рэжымнага аддзелу, 1973-07-07 г.н.

*«… у пачатку самым яна мяне, мякка кажучы, вельмі недалюблівала, гэта адчувалася. Аднойчы яна яшчэ ў 14-м атрадзе да нас прыйшла, а я яе не заўважыла, я тады дзяжурная была за сталом. І вось яна пачала мне рабіць заўвагу, потым яна паказала, каб паклікалі заггаса, яна пачала выгаворваць заггаса. Сказала: «А што гэта М. дрэнна абавязкі выконвае, дайце ёй такую працу, каб яна дакладна з ёй справілася, якая ёй падыходзіць, напрыклад, мыццё прыбіральняў».*

*«Мала таго, што ў невыносных умовах, невыносная ежа, гнілая гародніна, камяні ў кашы, чарвякі там. Дапусцім, мы выходзілі неяк са сталовай, Дашэўская такая: «Чаму вы ўсміхаецеся?». А я пыталася: «А што нам усміхацца нельга?». Яна кажа: «Не, нельга». Я кажу: «А чаму?». А яна: «Таму што гэта не прадугледжана правіламі ўнутранага распарадку».*

* https://luka.zone/person/1b42e74f-3623-4573-8591-ea67d9fa7879

**№003**



ФИО

**Драздоў Яўген Сяргеевіч***

должность, звание

супрацоўнік рэжымнага аддзелу, 1999-06-29 г.н.

*«Быў у нас такі Драздоў, гэта сын нейкай там начальніцы вялікай... Ён адзначыўся тым, што калі была праверка — страявая, гэта калі правяраюць форму, як у цябе прышытыя гэтыя біркі там. І ён хадзіў з лінейкай, мераў усе біркі, і калі там на паўсантыметра хаця б адрознівалася ад належнага, ён іх зрываў з асалодай. Прама вырываў з хрустам так... навошта ты іх увогуле псуеш, вам жа іх рабіць нанова, ламінаваць для таго, каб мы іх ізноў прышывалі. Але ён проста атрымліваў фізічнае задавальненне ад таго, што рваў прама з цябе. На яго нават ахоўніцы, якія былі разам з ім, глядзелі са здзіўленнем, маўляў, «сур'ёзна, ты навошта, ну навошта ты вось гэта робіш?»*

* https://luka.zone/person/ed9eaedc-1845-45fb-8d05-7c9891662545

## №004



**ФИО**

**Пырх Алена Дзмітрыеўна***

**должность, звание**

супрацоўніца рэжымнага аддзелу, 1978-01-04 г.н.

*«Пырх Алена Дзмітрыеўна … такая ўжо аматарка ўсялякіх гэтых пазачарговых шмонаў. Яна рэжымніца. Яна аматарка паганяць са скрынкамі з капцёркі».*

*«… у прэс-атрад я трапляла неаднаразова… маё знаходжанне ў гэтым атрадзе скончылася штрафным ізалятарам, то бок мне падкінулі іголку. Іголку падкідвала супрацоўніца Пырх Алена Дзмітрыеўна. Яна падкінула, то бок прыйшла ў атрад і кажа: «Мне трэба даглядзець тумбачку», і адразу мэтанакіравана ведае, дзе знаходзіцца мая тумбачка, у якім баку, дзе і як, адразу ж мэтанакіравана ідзе туды, адчыняе тумбачку, я не паспяваю яшчэ дабегчы, а тут яна мне агучвае: «Я ў цябе знайшла іголку, гэта рапарт, і ты ідзеш у штрафны ізалятар». І гэта значыць, я туды іду…»*

Сярод супрацоўнікаў асобна выдзяляюць **«кантралёраў»**. Гэта асобы, якія забяспечваюць знешнюю і ўнутраную ахову калоніі, канваяванне ўнутры калоніі, суправаджэнне асуджаных у розныя месцы ў калоніі, ажыццяўляюць праверкі асуджаных, могуць праводзіць вобшук (як асабісты, так і памяшкання).

*«Была такая там кантралёр Юр'еўна, яе потым зрабілі начальнікам атрада. Яна вельмі была з прыхільнасцю заўсёды. На нашую праверку вечаровую яна падышла да лакалкі, а мы яшчэ не сталі. «Ах вы не гатовыя, а вы павінны былі ўжо тут а 8 стаяць усе, выстраіўшыся. Усё, значыць, стаіце, пакуль я ўсю калонію не прайду, не праверу». І вось яна будзе хадзіць, хадзіць праз там паўгадзіны толькі прыйдзе».*

* https://luka.zone/person/a703fcab-69b7-4f66-8b37-8c613d1a024d

# ВЫСНОВЫ

Пенітэнцыярная сістэма — адзін з найважнейшых кампанентаў сектара бяспекі, яе асноўнымі задачамі з'яўляюцца забеспячэнне выканання закона і кантроль над яго выкананнем. Яна таксама абавязаная абараняць грамадства, ізалюючы ад яго асобаў, якія ўяўляюць сур'ёзную пагрозу іншым людзям, утрымліваючы патэнцыйных злачынцаў ад здзяйснення злачынстваў і перавыхоўваючы іх.

«Адзінае пакаранне для асуджанага — гэта пазбаўленне волі» — фундаментальны прынцып сістэмы выканання пакаранняў у многіх еўрапейскіх краінах.

Пенітэнцыярная сістэма Беларусі ў цяперашнім выглядзе захавала і эфектыўна выкарыстоўвае ўсе рудыменты савецкай пенітэнцыярнай сістэмы. На практыцы яна з'яўляецца адным са складнікаў сістэмы барацьбы рэжыму з іншадумствам, без уліку адрозненняў у патрэбах, правах і магчымасцях жанчын, мужчын, дзяўчат і юнакоў, яе метады працы не адпавядаюць стандартам у галіне правоў чалавека і не спрыяюць перавыхаванню зняволеных.

*Збор прынцыпаў абароны ўсіх асобаў, якія трапляюць пад затрыманне або зняволенне* ў якой бы там ні было форме* ўсталёўвае ў першым жа прынцыпе, што ўсе асобы, якія былі затрыманыя або зняволеныя ў якой бы там ні было форме, маюць права на гуманнае абыходжанне і павагу год-

* Прыняты ААН у 1988 годзе.

насці, уласцівай чалавечай асобе. Бангкокскія правілы, прынятыя ў 2010 годзе Генеральнай Асамблеяй ААН, якія датычацца абыходжання з жанчынамі-зняволенымі і мераў пакарання для жанчын-правапарушальнікаў, не звязаных з пазбаўленнем волі, абавязваюць дзяржавы прыняць меры для ліквідацыі прычынаў, якія прыводзяць жанчын да турэмнага зняволення, і наступстваў іх турэмнага зняволення.

У 1980 годзе Беларусь ратыфікавала *Канвенцыю аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын* (тут і далей — Канвенцыя), адсюль вынікае, што яе палажэнні абавязковыя да выканання дзяржавай. Артыкул 8 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь дэкларуе прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства. Пункт а) артыкула 5 *Канвенцыі* дэкларуе імкненне дзяржаваў-удзельніц прымаць усе адпаведныя меры з мэтай змены сацыяльных і культурных мадэляў паводзінаў мужчын і жанчын з мэтай дасягнення выкаранення забабонаў і скасавання звычаяў і ўсёй іншай практыкі, якія заснаваныя на ідэі непаўнавартаснасці або перавагі аднаго з полоў або стэрэатыпнасці ролі мужчын і жанчын.

*Мінімальныя стандартныя правілы абыходжання са зняволенымі** (далей — Правілы) змяшчаюць мінімальныя стандарты, якія павінны вытрымліваць пенітэнцыярныя ўстановы ў забеспячэнні правоў зняволеных. Гэта датычыцца і беларускіх пенітэнцыярных установаў у адпаведнасці з міжнароднымі абавязальніцтвамі краіны.

Звярнуўшыся да даследавання становішча жанчын у гомельскай жаночай калоніі № 4, асуджаных па палітычных матывах пасля 2020 года, аўтары сутыкнуліся з шакавальнымі фактамі, якія дазваляюць зрабіць пэўныя высновы датычна працэдураў і метадаў ужывання пакаранняў у дадзенай калоніі, якія груба парушаюць міжнародныя стандарты і правілы ўтрымання ў ізаляцыі жанчын.

Зыходзячы з атрыманых дадзеных і іх аналізу, а таксама зыходзячы з цяперашняй палітыкі рэжыму, выдаваць якія-небудзь канкрэтныя рэкамендацыі па іх ліквідацыі аўтарам дадзенай працы ўяўляецца немэтазгодным і немагчымым. Выснова ў дадзеным выпадку адна — пенітэнцыярную сістэму, у якой адбыццё пакарання для асуджанай становіцца гульнёй на выжыванне, неабходна цалкам рэарганізоўваць.

Умовы працы жанчын у ПК-4 нагадваюць від рабства, калі за ежу зняволенай даводзіцца цяжка працаваць 7 дзён на тыдзень і, з улікам іншых абавязковых гаспадарчых прац, нашмат больш, чым 40 гадзінаў у тыдзень. Спецыяльны дакладчык па пытанні аб сучасных формах рабства, у тым

* Прынятыя Кангрэсам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па папярэджанні злачыннасці і абыходжанні з правапарушальнікамі ў 1955 годзе.

ліку яго прычыны і наступствы, Тамая Абаката ў сваім дакладзе «Сучасныя формы рабства, што закранаюць людзей, якія знаходзяцца і раней знаходзіліся ў зняволенні» ад 19.07.2024 г. паказвае, што хоць выкарыстанне працы чалавека ў перыяд пазбаўлення волі як такое не ўяўляе сабой прымусовую працу ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі ў галіне правоў чалавека і працы, зняволеных варта прызнаваць працоўнымі, якія маюць права карыстацца ў частцы заробку, сацыяльнага забеспячэння, бяспекі і гігіены працы ўмовамі, супастаўнымі з умовамі, якія маюць працоўныя за межамі папраўчых установаў. Таксама ў дакладзе пазначана, што з Беларусі паступаюць паведамленні пра прымусовую працу.*

УВКПЧ устанавіла, што зняволеныя, якія змяшчаюцца па палітычна матываваных абвінавачаннях у калоніях па ўсёй Беларусі, падвяргаліся прымусовай і эксплуатацыйнай працы ў небяспечных умовах. Некаторыя апытаныя паведамлялі пра няшчасныя выпадкі, траўмы і негатыўныя наступствы для здароўя праз недахоп навучання, спецадзення або ахоўнага абсталявання.**

У ПК-4 не выконваюцца не толькі міжнародныя стандарты, але і нормы нацыянальнага права — перапіска палітычным зняволеным абмяжоўваецца, у дачыненні да іх здзяйсняюцца правакацыі, ужываюцца меры пакарання, не прадугледжаныя законам.

Абуральным з'яўляецца факт таго, што зняволеныя з'яўляюцца закладнікамі сістэмы, у іх няма ніякай магчымасці змагацца за свае правы ўнутры калоній, а ў адміністрацый і тых, хто аддае ім загады, ёсць карт-бланш на любыя здзекі. Улічваючы наяўнасць у Крымінальным кодэксе артыкула 411, тэрмін гэтых здзекаў у часе не абмежаваны.

Жанчын, асуджаных па палітычных матывах, у калоніі падвяргаюць сістэме адвольных і неадпаведных пакаранняў. Ім прысвойваецца статус «злоснага парушальніка», што цягне за сабой негатыўныя наступствы, уключаючы патэнцыйнае абвінавачанне і наступнае зняволенне ў штрафны ізалятар за «злоснае непадпарадкаванне». Пакаранні за гэтыя «парушэнні» з'яўляюцца неадпаведнымі і неабгрунтаванымі. Зняволеныя могуць утрымлівацца ў ШІЗА да 30 дзён у поўнай ізаляцыі ў бесчалавечных умовах утрымання.

Практыка адмовы ў своечасовай і якаснай эфектыўнай медыцынскай дапамозе, перадачы медыкаментаў, ператварае ўтрыманне асуджаных у гомельскай жаночай калоніі ў сур'ёзную пагрозу здароўю, у асобных выпадках яна даходзіць да смяротнай рызыкі. Адным з абуральных прыкладаў гэтага з'яўляецца сітуацыя з Марыяй Калеснікавай, якая праз ня-

* A/HRC/57/46, п.1, 30
** A/HRC/55/61, § 33

якасную ежу і жорсткія умовы утрымання ў карцары атрымала вельмі сур'ёзнае захворванне (правадную язву, зніжэнне вагі да 45 кг пры росце 175 см), якое можа мець доўгатэрміновыя наступствы для яе здароўя.

17 сакавіка 2022 года ў Жэневе Вярхоўная камісарка па правах чалавека Мішэль Бачэлет прадставіла даклад пра парушэнні правоў чалавека ў Беларусі. Сведкай выступіла Наталля Хершэ. Яна распавяла пра тое, што страчанае ў вельмі жорсткіх умовах карцара здароўе ў гомельскай калоніі ёй аднаўляць ніхто не збіраўся. Больш за тое, хваробны стан быў выкарыстаны для дадатковага ціску на палітзняволеную. Акрамя іншага, Наталля Хершэ расказала, што была сведкай катаванняў і ў дачыненні да іншых зняволеных. У калоніі яна была сведкай таго, як многіх жанчын, якія хварэюць на эпілепсію, саджалі ў карцар, а для ракавых хворых не было ніякіх паслабленняў.

Наталля Хершэ падчас свайго выступу ў Жэневе назвала імёны людзей, непасрэдна вінаватых у катаваннях зняволеных у гомельскай калоніі. Гэта начальнік калоніі **Тарасенкаў Дзяніс Анатолевіч**, загадчыца тэрапеўтычнага аддзялення **Сілкіна Святлана Аляксандраўна**.

Вярхоўны камісар ААН у сваім дакладзе ад 15.03.2024 года ўказаў, што ва УВКПЧ ёсць разумныя падставы меркаваць, што ў Беларусі было здзейсненае злачынства супраць чалавечнасці ў форме пераследу разам з іншымі спадарожнымі дзеяннямі, якія могуць быць усталяваныя як следства апісаных парушэнняў правоў чалавека.*

Аўтары расследавання сцвярджаюць, што шэраг супрацоўнікаў калоніяў з'яўляюцца саўдзельнікамі пераследу грамадзянаў па палітычных матывах і іншых злачынстваў супраць чалавечнасці**, якія здзяйсняюцца ў Беларусі да сённяшняга дня. Згодна з артыкулам 85 КК, правілы аб заканчэнні тэрмінаў даўніны для прыцягнення да крымінальнай адказнасці асобаў, якія здзейснілі крымінальнае злачынства, прадугледжанае артыкулам 128 КК, не ўжываюцца.

* A/HRC/55/61, п.52

** Артыкул 128 КК прадугледжвае крымінальную адказнасць за дзеянні, якія падпадаюць пад класіфікацыю злачынстваў супраць бяспекі чалавецтва. Сярод іх – незаконнае ўтрыманне ў зняволенні, масавае або сістэматычнае ажыццяўленне караў без суда, выкраданне людзей, за якім ідзе іх знікненне, катаванні ці акты жорсткасці, якія здзяйсняюцца ў сувязі з расавай, нацыянальнай, этнічнай прыналежнасцю, палітычнымі перакананнямі і веравызнаннем грамадзянскага насельніцтва.



© Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі, 2024